МОСКВА 19
УЛ. ФРУНЗЕ, 10 ИН. ТУТ
СОВ. СТРОИТ. И ПРАВА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 107 (5781) | 11 мая 1937 г., аўторак | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Палітычнае выхаванне ў сярэдняй школе.
Пісьмо планерыста Растаргуева таварышу Сталіну.
У Совеце Народных Камісараў Саюза ССР.
З. Квірынг — Аб формах уласнасці ў СССР.
Р. Соскін — Выхоўваць новыя, узрослыя партыйныя кадры.
На сходзе актыва работнікаў мастацтваў.
АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ ТРЭЦЯГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА — Інжынер А. Розін — Смялей разгортваць геолагаразведчую справу.
Р. Фралоў — На пленуме мазырскага акругкома партыі.
На раённых партыйных канферэнцыях гор. Менска.
М. Мельцын — Забытыя школы.
Н. Гасман — Пісьмы аб Біраб'джане.
ЗА РУБЯЖОМ:
Становішча ў Каталоніі;
У міжнародным камітэце па неўмяшанню ў справы Іспаніі;
Пратэст супроць бамбардыроўкі Гернікі;
Вымушаная пасадка рэспубліканскай эскадрыльі ў Тулузе;
На франтах у Іспаніі.

ПАЛІТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ Ў СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ

Совецкі настаўнік — не толькі педагог, але і выхавацель. Ён павінен даць вучням вядомую суму ведаў і разам з тым забяспечыць выхаваць совецкага грамадзяніна, маладога патрыёта сваёй радзімы, будаўніка комуністычнага грамадства.

Нашы будучыя кадры павінны паступова і няўхільна ўцягвацца ў палітычнае жыццё краіны, набываць палітычны вопыт і загартаванасць для будучай работы. Між тым наркаматы асветы самаўхіліліся ад задач палітычнага выхавання ў школе, ніхто за гэту работу не адказвае. Не выпадкова выкладанне Сталінскай Канстытуцыі, якое павінна адыграць выключную па сваёй выхаваўчай сіле ролю, вядзецца зусім незадавальняюча. Яшчэ няхайна мела халяўнае гніляя тэорыя, быццам выхаваўчай работай у школе павінны займацца спецыяльна вылучаныя для гэтай мэты людзі — вызваленыя класныя кіраўнікі. Настаўнік такім чынам адхіляўся ад выхаваўчай работы.

Астачы гэтай гнілой тэорыі яшчэ не зжыты да гэтага часу. Побач з перадавымі настаўнікамі, якія спалучаюць майстэрства навучання з высокім мастацтвам выхавання, ёсць яшчэ нямала і такіх педагогаў, якія наіўна лічаць, што выхаванне школьнікаў не адносіцца да іх прамых і непасрэдных абавязкаў. Нярэдка спасылаюцца пры гэтым на комсамольскіх арганізатараў, якія быццам павінны замяніць тут настаўніка.

Такі погляд глыбока памылковы і шкодны. Так, комсамол павінен весці палітыка-выхаваўчую работу ў школе, але гэта не знімае адказнасці з настаўнікаў. Комсамольскі арганізатар ні ў якай меры не павінен замяняць тут педагога-выхавацеля.

З якім інтарэсам, з якой неаслабнай увагаю слухаюць рэбяты на ўроку таго педагога, які ўмее палітычна заастрыць свой урок, насыціць яго злабадзённым зместам! Нашы дзеці цікавяцца ўсім: і Сталінскай Канстытуцыяй, і жыццём працоўных у капіталістычных краінах, і падзеямі ў Іспаніі, і грандыёзным размахам будаўніцтва ў Краіне Советаў, і мінулым нашай радзімы, і многімі іншымі палітычнымі пытаннямі.

Выкладчыца 193 школы г. Масквы тав. Зверава сістэматычна расказвае вучням свайго другога класа аб маляўнічым жыцці нашай краіны. Газетны нарыс, дзіцячы фільм, мастацкая літаратура ўмела выкарыстоўваюцца майстрам-педагогам. «Дзеці слухалі апавяданні аб бліскучай перамозе совецкіх музыкантаў, аб гераічным пераходзе жанчын-буратак, затаіўшы дыханне. Гутаркі па гэтым палітычным тэмы дапамагалі мне з першых дзён заваяваць аўтарытэт у класа», — гаворыць т. Зверава.

Для таго, каб палітычна выхоўваць маладое пакаленне, няма патрэбы прыбягаць да выдуманых «увязак» і пічкаць дзяцей «сухой палітыкай», не лічачыся з інтарэсамі, уласцівымі іх узросту. Наадварот, толькі захапляючае, жывое выкладанне, якое ўлічвае ўзроставыя асаблівасці вучняў, вядзе палітычна выхоўваць дзяцей, пачынаючы з малодшых класаў.

Кожны вучэбны прадмет дае велізарныя магчымасці для комуністычнага выхавання. Трэба толькі іх умела выкарыстаць.

Хіба не з'яўляецца невычарпальнай крыніцай палітычнага выхавання выкладанне гісторыі? Любоў да сваёй радзімы, страсная нянавісць да эксплаататараў, гарачая любоў да герояў, высунутых барацьбой прыгнечаных класаў за сваё вызваленне, ідэі інтэрнацыяналізма, — усе гэтыя якасці павінны прывівацца вучням на ўроках гісторыі. Такія-ж шырокія магчымасці для палітычнага выхавання раскрываюцца і на ўроках геаграфіі.

А прыродазнаўства? Хіба не ганаровая роля настаўнікаў фізікі і хіміі, закліканых узброіць дзяцей матэрыялістычнымі ведамі аб свеце, выхаваць людзей, свабодных ад забабонаў і рэлігійных прадрассудкаў і здольных змагацца з імі! У распаўджэнні прыродазнаўцаў знаходзіцца выдатны матэрыял нашага социялістычнага будаўніцтва, якое ператварае прыроду з дапамогай навукі.

Роля антырэлігійнага выхавання асабліва ўзрастае ў сучасны момант. У гэтай галіне ў школе амаль нічога не робіцца. Між тым, паркоўнікі ўсіх маспей актывізуюць работу сярод моладзі, пашыраюць свой тлетворны ўплыў і на дзяцей. Так, у сяле Бехцеева, Андрэеўскага раёна, Заходняй вобласці, сектанты прыцягвалі школьнікаў да перапісвання рэлігійных лістовак. Многія нашы работнікі да гэтага часу не разумеюць, што атэізм трэба выхоўваць у дзяцей з раннік год, процістаўляючы рэлігійнаму хурману — навуку, сляпой веры — веды.

Няма ні аднаго вучэбнага прадмета ў совецкай школе, які астаўся-б у старане ад задач палітычнага выхавання. Разумеецца, выконваць гэтыя задачы не трэба за кошт урэзак або змен школьнай праграмы. Сістэматычнае вывучэнне вучэбных прадметаў — закон для настаўніка.

Вядома, вучэбны матэрыял сам па сабе не вычэрпвае выхаваўчых магчымасцей, якія мае педагог. Самы парадак работы, яе арганізацыя, дысцыпліна на ўроку, выхаваўчая работа па-за класам маюць першаступеннае, рашаючае значэнне.

Можна назваць рад фактаў, якія сведчаць аб неабходнасці напомніць гэтыя простыя, здавалася-б, ісціны.

Да гэтага часу школа не мае статута. Работу класных кіраўнікоў ніхто не кантралюе. Палітычных гутарак са школьнікамі не правозяць ні настаўнік, ні комсорг. Нават на піонерскіх зборах пытанні палітычнага жыцця краіны, вельмі цікавячыя нашых дзяцей, не ставяцца.

Гэтым разгільдзяйствам і наркомасветаўскай бясклопатнасцю ў справе выхавання карыстаецца класавы вораг. Ён падсоўвае нашым дзецям злазлейскія частушкі, контрэволюцыйныя песні, правацыруе хуліганства. А бывае і горш. Забойства малодой настаўніцы Новазавідаўскай сярэдняй школы (Калінінская вобласць) Зоі Пешахонавай — сур'ёзны сігнал аб рабоце класавага ворага ў совецкай школе.

І там, дзе класава-варожыя ўплывы прапіклі ў школу, настаўнік не павінен рабіць іх сакрэтам ад вучняў, а, наадварот, павінен процідаставіць чужому ўплыву здаровыя настроі вучняў, мабілізаваць іх, прыцягнуць іх да барацьбы з усім чужым і школным у дзіцячым асяроддзі і на гэтых прыкладах вучыць моладзь.

Усё гэта прад'яўляе павышаныя патрабаванні да совецкага настаўніка, які ажыццяўляе вялікую і пачесную задачу выхавання будаўнікоў комуністычнага грамадства. Няма чаго закрываць вочы на тое, што ёсць яшчэ многа педагогаў, якія не ў сілах праводзіць гэту работу, якія самі маюць патрэбу ў падняцці свайго палітычнага ўзроўню. Гэта з усёй відавочнасцю паказала атэстацыя. Аднак, ні наркаматы асветы, ні профсаюз работнікаў пачатковай і сярэдняй школы нічога не робяць для таго, каб узброіць палітычнай зброяй настаўніка, расшырыць яго кругазор, даць яму магчымасць несці свае палітычныя веды ў школу.

Такое становішча далей нецярпіма. Неабходна па-большэвіцку ўзяцца за ўмацаванне выхаваўчай работы ў нашай школе, зрабіць кожнага настаўніка поўнапраўным і адказным выхавацелем нашых дзяцей, зрабіць кожную школу крэпасцю комуністычнага выхавання.

„Правда"

У БЛІЖЭЙШЫЯ-Ж ДНІ ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАННЕ РЭСПУБЛІКІ Ў СЯЎБЕ

НЕ ЗМАГАЮЦЦА ЗА ЯКАСЦЬ СЯЎБЫ

Ва многіх калгасах Магілеўскага раёна няма барацьбы за добраякаснае правядзенне веснавой пасеўнай кампаніі, груба парушаюцца элементарнейшыя правілы агратэхнікі сяўбы. Агрономы райэмаддзела і машынатрактарных станцый раёна зусім слаба сочаць за якасцю падрыхтоўкі глебы і за якасцю сяўбы.

Напрыклад, трактарысты Мельнік І. і Шаршнёў, Лупалаўскай машынатрактарнай станцыі, працуючы ў калгасе «Чырвоны партызан», Слабодскага сельсовета, нарабілі трактарамі вельмі многа агрэхаў. Гэтыя-ж трактарысты даюць брак і на баранаванні. Там, дзе трэба баранаваць у два сляды, яны барануюць у адзін след, а ва многіх месцах зусім прапускаюць дзёрн ворыва.

У калгасе «Чырвоны сцяг», Гаранскага сельсовета, сейбіты Карнееў і Юркоў сістэматычна не высявалі норму насення. Такім чынам яны недасеялі 23 кілограмы ільнонасення, якое прысвоілі сабе. Гэтыя-ж сейбіты, сеючы пшаніцу, недасеялі на 10 гектарах па 40 кілограм насення на кожным гектары. Застаўшуюся пшаніцу ўзялі сабе.

Старшыня калгаса імя Сталіна, Мастоцкага сельсовета, Сідаренка загадаў сеяць авёс уаднавор. Аб гэтым шкодніцкім загадзе старшыні калгаса даведаліся ў райвыканкоме толькі тады, калі ў калгасе было ўжо засеяна 10 гектараў аўса ўаднавор. Райвыканком за гэта злачынства «пакараў» Сідаренку—вынес яму вымову.

Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што кіраўнікі Магілеўскага раёна і дырэктары машынатрактарных станцый гэтага раёна вельмі слаба звязаны з калгасамі, не ведаюць сапраўднага становішча ходу сяўбы ў раёне. Няма ў Магілеўскім раёне большэвіцкай барацьбы за хутчэйшае і добраякаснае правядзенне сяўбы, за лёс будучага ўраджаю.

С.

НЯМА ПРАЦОЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Вельмі марудна ідзе сяўба ў калгасе імя Якаўлева, Забабскага сельсовета, Будакашалёўскага раёна. Да гэтага часу засеяна ўсяго некалькі гектараў зернавых. Асноўнай прычынай заняжкі сяўбы з'яўляецца тое, што ў калгасе вельмі слабая працоўная дысцыпліна. На работу калгаснікі выходзяць позна, на абедзеньня перапынкі трацілца многа часу і работу пакідаюць вельмі рана.

У брыгадзе Гарнова многія калгаснікі і калгасніцы зусім не выходзяць на работу.

Справа ў тым, што ў калгасе зусім дрэнна пастаўлен учот працадзён. Ні адзін калгаснік не ведае ўвечары, колькі ён выпрацаваў за дзень.

Усё гэта вельмі албіваецца на працоўнай дысцыпліне. Калгаснікі і калгасніцы неахвотна ідуць на работу, з-за чаго зрываецца веснавая сяўба.

Старшыня калгаса Шаўпоў Амельян не прымае ніякіх мер, каб наладзіць своечасовы запіс працадзён калгаснікам і арганізаваць работу па хутчэйшаму і добраякаснаму сканчэнню сяўбы.

САЛАЎЁЎ.

ТРАКТАРЫ ПРАСТОИВАЮЦЬ ТЫДНЯМІ

Бялзішчанская МТС, Уваравіцкага раёна, мае ўсе ўмовы для перавыканання плана трактарных работ. Аднак трактары прастойваюць больш чым працуюць, сеялкі не скарыстоўваюцца.

У калгасах Борхаўскага сельсовета з-за нязначных паломак і адсутнасці гаручага трактары прасталі па віне МТС 11 сутак. У другой брыгадзе трактары прасталі 6 дзён. У брыгадзе тав. Кантусава 6 трактароў не працавалі 10 дзён.

МТС мае 6 сеялак, але яны на сяўбе поўнасцю не скарыстоўваюцца. Такое становішча нікога ў раёне не трывожыць. РВК і РК КП(б)Б думаюць, што за вынікі сяўбы будзе несці адказнасць хто-небудзь іншы, а не яны. У калгасе імя Кліма Варашылава сеялка прастаяла без работы 10 дзён. У калгасе імя Будзённага пасеяна радковай сеялкай 25 гектараў, а трэба засеяць 100 гектараў.

Старшы агранам МТС тав. Маркаў у калгасе «Новае жыццё» так адрэгуліраваў сеялку, што замест высеву пшаніцы 1,6 цэнт. на гектар па норме, высявалі 1,1 цэнт. Прышлося 9 гектараў пшаніцы перасеяць.

Сеялкі ў калгасах часта прастойваюць з-за розных паломак, а механікі Галубовіч і Эйнін своечасова іх не рамантуюць. У выніку дрэнная арганізацыя работы план радковай сяўбы выканан толькі на 35 проц.

Да яравізацыі насення агранам Маркаў адносся зусім несур'ёзна. У калгасе імя Кліма Варашылава ён адразу заяравізаваў 30 тон збожжа, якое замест 7—8 дзён яравізаваў 11 дзён. Зярно за гэты час так набухла, што не пралезла ў рукавы сеялкі, прышлося сеяць рукамі. Задзелка насення праведзена дрэнна. Пасля баранавання многа зярнят асталося на паверхні. Так было і ў калгасах «Ударнік пяцігодкі» і «Авангард».

У калгасе імя Будзённага трактары аралі мелка і з агрэхамі. У выніку такой работы 6 гектараў было забракавана.

Між тым ёсць трактарысты, якія паказваюць узоры барацьбы за высокую прадукцыйнасць працы. Трактарыст Салажкоў Ціхан за 10 гадзін забаранаваў 100 гектараў і зэканоміў 50 кілограмаў гаручага, але аб вопыце яго работы астатнія трактарысты не ведаюць.

Масавая работа сярод трактарыстаў адсутнічае. Газетамі трактарысты не забяспечаны. Совет пры МТС не працуе. Спецыялісты Маркаў, Галубовіч і Эйнін здарваліся ад трактарных брыгад і калгасаў. Яны рэдка калі бываюць на полі.

ТРЭСКУНОЎ, САЛОДКІН.

ЗАБЫЛІСЯ ПРА ТРАКТАРНУЮ БРЫГАДУ

Дырэктар Багушэўскай МТС тав. Галавёнак любіць пахваліцца жаночай трактарнай брыгадай. Але як-жа ён забяспечыў работу трактараў гэтай брыгады, як ён практычна дапамагае ёй?

Жаночая трактарная брыгада (брыгадзір тав. Алексіч) працуе ў Замастоцкім сельсавеце (старшыня Боесаў), але пра гэту брыгаду забыліся.

— Ужо вось два тыдні, — гаворыць трактарыстка тав. Старавойтава,—як мы працуем у Замастоцкім сельсавеце, але пакуль што не бачым ніякай дапамогі. За ўвесь час палявых работ толькі адзін раз заехаў да нас агранам МТС тав. Ліхса.

Трактарысткі Старавойтава і Яшкевіч працуюць зараз у калгасе імя Кірава, за дзень узорваюць па 7—8 гектараў, але старшыня гэтага калгаса тав. Якімаў не арганізаваў работу брыгады, трактарысткі харчуюцца дрэнна.

На полі каля трактарыстак рэдка хто бывае, не бачаць як яны працуюць. Маладым трактарысткам ніхто не дапамагае, а наадварот, МТС збіраецца ўжо перасадзіць іх за прышпіньчык.

Перад выхадам у поле МТС не забяспечыла брыгаду заправачным інвентаром. Трактар замест 2 вёдзер мае толькі адно, Яно служыць і для вады і для гаручага. Вада да месца работы не падвозіцца і трактарысткі вымушаны хадзіць на балоце ў пошуках годнай для трактара вады.

Трактар Старавойтавай робіць многа халастых пераездаў, бо ўвесь дзень трэба круціцца па маленькіх загончыках. Аб гэтым старшыня калгаса Якімаў нават не падумаў. Ён на кожным кроку зрывае работу трактара, не дае яму поўнай нагрузкі.

Дрэнна пастаўлена работа і па культурнаму абслугоўванню трактарыстаў. Машынатрактарная станцыя абяцала выпісаць на кожную трактарную брыгаду газеты, але так і не выпісала. Тав. Старавойтава скарэнькіла, што пасля работы дзяўчаты хацелі-б пачытаць, але няма чаго. Ні адна брыгада рушнікоў, зубнымі шчоткамі не забяспечана.

Неадпаразова было ўказанне ад Наркамзема перабудаваць у трактарах сядзенні як нязручныя для работы жанчынам, але аб гэтым МТС (дырэктар Галавёнак) не паклапаціцца, дзяўчаты і па сённяшні дзень адчуваюць вялікую нязручнасць седзячы на сядзенні мужчынскага ўзору.

ДМ. МАЛЕВІЧ.

СТАХАНАЎЦЫ СЯЎБЫ

Перад выхадам у поле трактарысты свінагалоўчага соўгаса «Старчыцы», Чырвонаслабодскага раёна, заключылі паміж сабою социялістычны дагавор на хутчэйшае і добраякаснае правядзенне пасеўнай кампаніі.

З спаборнічаючых паміж сабой на першым месцы аказаліся трактарысты-комсамольцы Шадурка і Драбеня. На трактары «ХТЗ» трохкорпусным плугам Шадурка ўзорвае па 12—14 гектараў за змену, эканоміць гаручага ад 30—40 кілограмаў у змену. Заработак яго складае 65—70 рублёў у дзень.

Дырэктар соўгаса т. Сіновіч загадам абвясціў Шадурка падзяку і выдаў яму грашовую прэмію. Трактарыст Драбеня на трактары «ХТЗ» узорвае на 8—9 гектараў за змену.

М. ІВАШКЕВІЧ.

НА СХОДЗЕ АКТЫВА РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ

Учора ўвесь дзень прадаўжаліся спрэчкі па дакладу т. Ткачэвіча.

Яны хутчэй нагадваюць выказванні на чарговай вытворчай нарадзе, чым глыбокі і ўсебаковы аналіз становішча спраў на фронце мастацтваў рэспублікі.

Але з тых, пакуль што асцярожных, прамоў, часамі з абязлічанай крытыкай, якая даходзіць не далей загадчыкаў сектараў (Модаля), высвятляецца выключна дрэнная работа Кіраўніцтва па справах мастацтваў.

Таварышы Бернардаў, Рахленка, Дольнікаў, Гаеўскі, Саннікаў і іншыя гаварылі ў сваіх выступленнях, што тэатры БССР працавалі абасоблена. Паміж імі няма патрэбнай сувязі і абмену творчым вопытам.

Гастралёрскія палёты, грубы выкрык, беспрынцыпнасць — такі стыль работы Кіраўніцтва па справах мастацтваў. Яно самаўхілілася ад пытанняў рэпертуара тэатраў, асабліва справы стварэння нацыянальнай тэматыкі, і прадставіла самацёку падрыхтоўку і вылучэнне кадраў.

Суровым абвінавачваннем Кіраўніцтву па справах мастацтваў прагучэла прамова артыста Лурэйскага дзяржаўнага тэатра тав. Астроўскага. Ён, гаворачы аб шкодных тэндэнцыях у кіраўніцтве тэатрам, падкрэсліў, што гэта прывяло да таго, што масавы глядач не любіць тэатра. Выкрытыя ворагі народу — Дунец і інш. шмат шкодзілі. Але ў тэатры, ліквідуючы вынікі іх падрыўнай дзейнасці, адкрываюцца «на страляўчніках». Тэатр згубіў свой палітычны твар. Работнікі тэатра не маюць свайго слова аб рэпертуары і іншых справах, бо грамадская і вытворчая работа ў загоне. Партыйная арганізацыя слепа пягнецца за Рафальскім. Парторг тэатра Мошін і Рафальскі ўзаемна ўсхваляюць адзін другога. Крытыка і самакрытыка заціснута.

Злачынныя справы, якія тварыліся ў тэатры юнага глядача, дзе доўгі час беспакарана арудавалі ворагі народу (Сташэўскі, Зарэцкі) і іх прыспешнікі — Радкевіч, Канзін), таксама кідаюць святло на бестурботнасць Кіраўніцтва па справах мастацтваў.

Мастакі Лейтман, Керзін, Гаўрыленка, Малкін і Гусеў у сваіх выступленнях зусім справядліва абураліся тым, што Кіраўніцтва па справах мастацтваў фактычна адштурхнула ад сябе мастакоў, не пікавіцца іх творчай работай. Тав. Малкін гаворыць, што мастакі яшчэ не дачакаліся такога часу, каб да іх хто-небудзь прыйшоў з Кіраўніцтва па справах мастацтваў. Калі-ж хто-небудзь з іх напрабуе сам прыйсці ў кіраўніцтва, дык пачасці на «прыём» да т. Пасюкевіча ніяк не зможа. Мастакі не прыцягнуты да работы ў кіно і тэатрах. Творчая вучоба, асабліва маладых мастакоў, зусім не наладжана. Скульптары БССР таксама працуюць неарганізавана.

Сёння — працяг спрэчак. Іх ідэйны ўзровень павінен быць рэзка ўзняты. На аснове шырокага разгортвання крытыкі і самакрытыкі, не зважаючы на асобы, удзельнікам схода актыва трэба рашуча ўскрыць буйнейшыя памылкі і недахопы на фронце мастацтваў, выкрыць ка-нпа падрыўную дзейнасць ворагаў народу на гэтым участку, якія перашкаджаюць шырокаму развіццю мастацтва беларускага народу.

Ал. ЛЕБЕДЗЕЎ.
П. КАВАЛЁЎ.

Пісьмо планерыста Растаргуева таварышу СТАЛІНУ

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

На аднамесным планеры «ГН-7» канструкцыі комсамольца Грошэва я ўстанавіў новы міжнародны рэкорд дальнасці палёту па прамой, праляцеўшы 539 кілометраў 623 метры. У гэтыя радасныя дні мне хочацца выразіць вам сваю палкую любоў і падзяку за велізарныя клопаты аб нашай моладзі. Перадаю сваю гарачую падзяку партыі і комсамолу, выхаваўшым і вырасціўшым мяне. Абяцаю вам не спыняцца на дасягнутым, а ісці ўсё далей наперад, удасканальваюся ў лётнай справе, дабіваюся новых рэкордаў.

В. РАСТАРГУЕЎ,
майстар совецкага планерызма.

Міжнародны рэкорд дальнасці палёту па прамой на аднамесным планеры

ПАСТАНОВА СПАРТЫЎНАЙ КАМІСІІ ЦЭНТРАЛЬНАГА АЭРАКЛУБА СССР ІМЯ А. В. КОСАРЗВА

Разглядзеўшы матэрыялы і пратаколы, прадстаўленыя спартыўнымі камісарамі Цэнтральнага аэраклуба СССР тт. Трунова Н. Н. і Ганчаровым І. М. 1 вылічэнні дальнасці, праведзеныя штурманам Цэнтральнага аэраклуба тав. Шэпелевым Н. С. аб палёце майстра совецкага планерызма тав. Растаргуева В. Л. на аднамесным планеры «ГН-7», зробленым 5 мая 1937 года па маршруту: Масква, Тушынскі аэрадром (месца адчэпкі планера) — сяло Даевіца, Варонежскай вобласці (месца пасадкі),

пастанавілі:

1. Засведчыць адлегласць на прамой, пройдзеную без пасадкі майстрам совецкага планерызма тав. Растаргуевым В. Л., роўную 539 кілометрам 623 метрам.

2. Прызнаць вынік палёту ўсесаюзным (нацыянальным) рэкордам дальнасці па прамой па класу «Д» — аднамесных планераў.

3. Прадставіць адпаведныя матэрыялы прэзідыуму Міжнароднай авіяцыйнай федэрацыі (ФАІ) для засведчання гэтага рэкорда, як міжнароднага па класу «Д» — аднамесных планераў.

Старшыня спартыўнай камісіі Цэнтральнага аэраклуба СССР
намбрыг М. ДЗЯЧ.
Сакратар Н. МАМІЧЗВА.

10 мая 1937 г.

У СОВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР

9 мая г. г. пад старшынствам тав. В. М. Молатава адбылося чарговае пасяджэнне Совета Народных Камісараў СССР.

Соўнарком абмеркаваў даклад Наркомлеса СССР т. Іванова аб рабоце папяровай прамысловасці ў 1937 годзе. Гэта прамысловасць, не гледзячы на ўсё ўзрастаючыя патрабаванні да яе з боку гаспадаркі і культурных устаноў краіны, з'яўляецца адной з адсталых. За апошнія гады папяровая прамысловасць не выконвае ўстаноўленых для яе дзяржаўных планаў як па колькасці, так і асабліва па якасці выпускаемай прадукцыі. Гэта адставанне прадаўжаецца і ў бягучым годзе.

Адзначыўшы рад сур'ёзных недахопаў у рабоце папяровай прамысловасці, Соўнарком даручыў камісіі пад старшынствам тав. Анціпава з прыцягненнем ряду дырэктароў папяровых фабрык распрацаваць неабходныя мерапрыемствы, якія павінны быць ажыццёўлены Наркомлесам для неадкладнага паляпшэння работы папяровай прамысловасці.

Далей Соўнарком абмеркаваў пытанне аб вытворчасці тэкстыльнага абсталявання.

Абмеркаванне гэтага пытання ў Соўнаркоме паказала, што прадпрыемствы лёгкага машынабудаўніцтва Наркампяжпрома не прынялі патрэбных мер да выканання праграмы па вытворчасці тэкстыльных машын. Замест барацьбы за выкананне ўстаноўленых урадам вытворчых праграм, Наркампяжпром, Наркамот абаронная прамысловасці і Наркамлегпром пайшлі па шляху змяншэння праграм бягучага года.

Соўнарком прызнаў няправільнымі дзеянні Наркампяжпрома, Наркамата абаронай прамысловасці і Наркамлегпрома СССР, накіраваныя на зніжэнне ўстаноўленай Соўнаркомам СССР на 1937 г. вытворчай праграмы па тэкстыльнаму абсталяванню, і прапанаваў гэтым наркаматам неадкладна адмяніць даныя імі ў гэтым напрамку распараджэнні.

Соўнарком даручыў камісіі пад старшынствам тав. Чубара, з прыцягненнем дырэктароў заводаў тэкстыльнага машынабудаўніцтва, распрацаваць практычныя мерапрыемствы, якія-б спецыяльна забяспечылі вытворчасць абсталявання для бавоўняных фабрык у бягучым годзе, а таксама расшырэнне вытворчасці абсталявання для тэкстыльнай прамысловасці ў 1938 г.

Соўнарком СССР разгледзеў прадстаўленыя Наркаматам аховы здароўя СССР і Дзяржпланам прапановы аб санітарнай ахове водаправодаў і крыніц водаснабжэння.

Соўнарком зацвердзіў гэтыя прапановы і пастанавіў унесці іх на зацверджанне ЦВК СССР.

Соўнарком таксама разгледзеў і прыняў прадстаўлены ВЦСПС бюджэт дзяржаўнага соцыяльнага страхавання на 1937 год.

Соўнарком абмеркаваў па дакладу ВЦСПС пытанне аб пашырэнні на служачых пенсійнага забеспячэння па старасці і ліквідацыі некаторых абмежаванняў, існуючых для служачых у параўнанні з рабочымі ў галіне пенсій і дапамог па дзяржаўнаму соцыяльнаму страхаванню.

(БЕЛТА).

ХОД СЯЎБЫ ПА СССР

МАСКВА, 10 мая. (БЕЛТА). Згодна даных Наркамзема Саюза ССР, на 5 мая ўсяго засеяна 57.115 тыс. гектараў. Дзяржаўны план веснавой сяўбы выкананы на 61 проц. супроць 53 проц. у мінулым годзе. Соўгасамі ўсіх сістэм план выкананы на 54 проц.

На 5 мая па Саюзу калгасамі ўзарана 3.754 тыс. гектараў папару. Гэта толькі 13 проц. плана і на чвэрць мільёна гектараў менш чым на той-жа тэрмін у мінулым годзе. Асабліва адстаюць паўднёвыя раёны.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА ФРАНЦЫІ

ВЫСТУПЛЕННЕ ФРАНЦУЗСКАГА МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ДЭЛЬБОСА

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 10 мая. (БЕЛТА). Учора у Сен-Дызье (дэпартамент Верхняй Марны) міністр замежных спраў Францыі Івон Дэльбос выступіў з прамовай па пытанню аб міжнароднай палітыцы.

Дэльбос заявіў, што Францыя, будучы адданай справе міру, павінна ўнікаць у сваёй палітычнай дзейнасці двух падводных камянёў: не трэба стварэць уражанне аб уласнай слабасці і ў той-жа час не трэба рабіць грубых жэстаў.

«Пастаянна праяўляемае імкненне ісці на ўступкі, — гаварыў далей Дэльбос,— не заўсёды і не ўсюды будзе разглядацца як заклік да міру, да ўстанаўлення згоды.

Другі падводны камень — гэта правакацыі. Нам часам гаворацъ: вы недастаткова стукалі кулаком па сталу. Мы лічым за лепшае, сапраўды, захоўваць халоднакроўнасць. Калі-б у вядомых абставінах мы дзейнічалі інакш, ці захавалі-б мы дружбу Англіі, тую самую дружбу, аб якой гаворацъ, што пакуль гэта дружба прадаўжаецца, вайна можа быць пазбегнута? Наша дружба з Англіяй ніколі не была больш цеснай і жывой, чым сёння».

Далей Дэльбос заявіў: «Ніхто больш мяне не аддае належнага імкненню да міру, якое наглядаецца з боку Совецкага Саюза, і ніхто больш мяне не поўны рашучасці паважаць франка-совецкі дагавор і захаваць яго першапачатковы сэнс». «Дружба з ЗША — з аднаго боку, вялікае імкненне совецкага Урала да міру — з другога, аказваюць няямерны ўплыў на роўнавагу маральных сіл».

Інтэрвенты не ўпэўнены ў сваіх салдатах

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзіденцыя Урада), 9 мая. (БЕЛТА). Газета «Палітыка» (орган рэспубліканскай левай) публікуе рад дакументаў, захопленых у італьянцаў на паўночным фронце. Гэта — загады па палку «чорныя стрелы», з якіх відаць, што італьянскае камандаванне не ўпэўнена ва ўласных салдатах. У адным загадзе гаворыцца, што унтэр-афіцэры не жадаюць насіць значкі, якія ўказваюць на іх званне. Другі загад, азаглаўлены «Перасцярога супроць комуністычных замахаў», адзначае, што «ў раёне адкрыта прысутнасць падазроных асоб. Зроблены спробы ўзарваць дынамітам чыгуначную лінію, ёсць разрывы тэлеграфнай і тэлефоннай сеткі. Каб унікнуць гэтага, ахова штабаў павінна заўсёды быць напагатове, афіцэрам заўсёды быць пры зброі».

Раскрыта шпіёнскае гняздо

ВАЛЕНСІЯ, 9 мая. (БЕЛТА). Рэспубліканскай паліцыяй раскрыта шпіёнскае гняздо ў нядаўна адкрыўшайся ваеннай школе ў Патэрна (правінцыя Валенсія). Праведзен рад арыштаў. Сярод арыштаваных — урач морскага ведамства Лопес, які да нядаўняга часу быў суднавым урачом на эсмінцы у морскай базе Картахены. Лопес і яго пяць братоў рэгулярна снабжалі фашысцкі штаб весткамі аб прасоўванні рэспубліканскіх караблёў. Яго браты таксама арыштаваны.

Делегат СССР на карантыйныя ... пасол СССР у Англіі тав. І. М. Майскі (БЕЛТА).

НА РАЕННЫХ ПАРТЫЙНЫХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ

СТАЛІНСКІ РАЁН

Учора закончыла сваю работу партыйная канферэнцыя Сталінскага раёна. Канферэнцыі прышлося двойчы абмеркаваць і галасаваць склад рэвізійнай камісіі райкома. У першы раз з намечаных кандыдатур у спіс для тайнага галасавання большасць галасоў атрымалі толькі два чалавекі, астатнія атрымалі менш паловы галасоў. Прышлося ў другі раз абмеркаваць спіс кандыдатур у склад рэвізійнай камісіі. Пры паўторным галасаванні дадаткова абрана ў рэвізійную камісію яшчэ 3 чалавекі.

Пасля агалашэння рэзультатаў тайнага галасавання дэлегатаў з дарадчым голасам на гарадскую партыйную канферэнцыю г. Менска, райпартканферэнцыя закончыла сваю работу.

На працягу шасці дзён канферэнцыя абмяркоўвала пытанні становішча партыйнай работы ў раёне, падвергла рэзкай крытыцы недахопы як у рабоце райкома партыі, так і ўсёй раённай партарганізацыі.

Па таму, як дэлегаты з усёй большэвіцкай праматой выкрывалі буйныя прарывы ў партыйнай рабоце, як сур'ёзна аднесліся да абмеркавання кандыдатур у склад новага райкома і дэлегатаў на горпартканферэнцыю, можна судзіць, як узрасла палітычная актыўнасць і большэвіцкая пільнасць у арганізацыі.

Канферэнцыя асудзіла паводзіны асобных таварышоў, якія несур'ёзна падышлі да вылучэння кандыдатур у склад партарганаў і на гарадскую партыйную канферэнцыю.

Новы склад райкома партыі павінен неадкладна ўзяцца за практычнае ажыццяўленне рашэнняў партыйнай канферэнцыі, якія поўнасцю выцякаюць з гістарычных рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б), даклада і заключнага слова таварыша Сталіна.

Пасля сканчэння канферэнцыі адбыўся пленум райкома. Тайным галасаваннем выбран сакратар райкома тав. М. І. Лісковіч — член партыі з верасня 1917 года, член ЦК КП(б)Б, да апошняга часу працаваў сакратаром Касцюковіцкага райкома. Тайным галасаваннем таксама выбран намеснік сакратара райкома тав. А. С. Дзяткова.

У склад бюро райкома выбрана 7 чалавек: Лісковіч, Дзяткова, Озірскі, Грабенюк, Юргансон, Рабкін — сакратар парткома фабрыкі «Комунарка» і Власаў — сакратар парткома ВКСГПБ.

Культпропам райкома пленум запвердзіў т. Озірскага.

О. К.

КАГАНОВІЦКІ РАЁН

10 мая на ранішнім пасяджэнні канферэнцыі праходзіла тайнае галасаванне кандыдатаў у члены райкома. Пры падліку вынікаў галасавання аказалася, што ні адна кандыдатура (з 27, якія былі ў спісу) не атрымала большасці галасоў на права быць выбранай кандыдатам у члены райкома. Канферэнцыя правяла ў другі раз абмеркаванне кандыдатур і тайнае галасаванне, пасля якога было выбрана 7 кандыдатаў.

На ранішнім і вячэрнім пасяджэннях абмяркоўваліся кандыдатуры ў спіс для тайнага галасавання дэлегатаў на гарадскую партыйную канферэнцыю.

Сёння ранішняе пасяджэнне канферэнцыі пачынаецца тайным галасаваннем дэлегатаў на гарадскую партыйную канферэнцыю.

Ц. ФРЫД.

Пленум Варашылаўскага райкома партыі

Учора адбыўся першы Пленум упоўнаважанага Варашылаўскага райкома партыі. У рэзультаце тайнага галасавання сакратаром райкома абран тав. Кавалёў, намеснікам сакратара тав. Перачынскі.

Бюро абрана ў складзе 7 чалавек: тт. Кавалёў, Перачынскі, Чорны (сакратар парткома політэхнічнага інстытута), Алер (культпроп РК), Краўчанка (нач. падзіў), Батукоў (сакратар парткома завода імя Молатава) і Коган (сакратар райкома комсамола).

На Пленуме рэўкамісіі райкома тайным галасаваннем абран старшынёй тав. Яцкевіч.

Р. Д.

ПАРАДНАСЦЬ І САПРАЎДНАСЦЬ

У свой час на мазырскім фанерным заводзе «Чырвоны Кастрычнік» было нямала стаханаўцаў. Іх часта збіралі, гаварылі аб складанні неабходных умоў для працы, адзначалі прэміраваннем. Але ўся гэта работа насіла галоўным чынам парадны характар. Канкрэтнае кіраўніцтва стаханаўскім рухам палменьвалася шуміхай. У выніку — дасягнутыя асобнымі стаханаўцамі рэкорды не былі замацаваны. Больш таго, некаторыя з іх цяпер нават не выконваюць свае нормы. Прычым, характэрна, што невыкананне норм выпрацоўкі мае месца, галоўным чынам, у вядучым лушчыльным цэху, дзе праца рабочага амаль поўнасцю механізавана.

Тут ёсць стаханаўцы, якія надрэнна авалодалі тэхнікай і пры нармальных умовах работы значна перавыконваюць свае нормы. Але такіх «шчаслівых» дзён у цэху бывае мала. Станкі тут прастойваюць цэлымі гадзінамі па незалежачых ад рабочых прычынах. 26 красавіка ў першай змене (майстар т. Рапецкі) два сушыльныя прасы спынілі работу з-за тэхнічных непаладак. Адзін з іх прастаяў гадзіну, а другі астаўся стаяць на другую змену. Брыгада сушыльшчыкаў, на чале з старым рабочым Гутэрманам, вымушана была прапаваць усю змену на адным прэсе, прычым таксама далёка не спраўным. З гэтай прычыны палову фанеры даводзілася перасушваць другі раз.

У гэты-ж дзень была аварыя яшчэ аднаго прэса; у ім трэснула паравая трубка, што выклікала прастой брыгады больш чым на гадзіну.

Тэхнічныя аварыі і непаладкі на заводзе — сістаматычная з'ява. Яны прымушаюць рабочых прастойваць амаль палову свайго рабочага часу.

Тэхкіраўнік завода Афанасьеў у пэхах бывае вельмі рэдка і не ведае сапраўднага становішча тэхнічнай гаспадаркі. Тым больш не ў курсе справы сам дырэктар завода Вазнесенскі.

У пэхах нехапае ваганетак для перавозкі фанеры з аднаго месца на другое. Больш таго, дырэкцыя нават не лічыць сваім прамым абавязкам адрамантаваць у пэхах падлогу, каб па ёй лёгка можна было пускаць ваганеткі.

У часе дажджоў у пэхах завода на галавы рабочых пурчаць струменні «халодных душаў». Многія з рабочых вымушаны спыняць работу і шукаць месца ад дажджу.

Чым, як не адзекамі з рабочых, як не прамым тормазам разгортвання стаханаўскага руху можна назваць такія адносіны да стаханаўскай работы? Гэтага не могуць зразумець кіраўнікі завода. Яны больш толькі гаворыць аб стаханаўскім руху, а неабходных умоў для работы стаханаўцаў не ствараюць.

РЫГОРАЎ.

Чытка газеты ў паляводчай брыгадзе калгаса «Калектыўная праца», Петрыкаўскага раёна. Фото В. Лупейка (БСФ).

НА ПЛЕНУМЕ МОЗЫРСКАГА АКРУГКОМА ПАРТЫІ

Справаздачна-выбарчыя сходы ўскрылі нямала прычын нездавальняючага становішча партыйна-выхаваўчай работы ў Мозырскай акруговай партыйнай арганізацыі. Аднак, асноўныя прычыны былі выкрыты толькі на пленуме акругкома, які адбыўся 6—7 мая.

У чым сутнасць гэтых прычын? У тым, што ўнутры бюро акругкома на працягу доўгага часу Дубіна вёў бяспрынцыпную сварку з бюро акругкома партыі. Дубіна, якому партыя даверыла важнейшы ўчастак работы, з самага пачатку арганізацыі акруг стаў на шлях процістаўлення сябе і свайго апарата акругкому партыі, усямерна прабуючы ўслізнуць ад партыйнага кіраўніцтва.

Важнейшае пытанне, як падбор кадраў, Дубіна вырашаў без ведама бюро акругкома. І таму невышадкова, што ў апараце акрвыканкома аказалася шмат жулікаў, прахадзімцаў і прамых ворагаў народу. Дубіна даходзіў да такой наглясці, што забараняў загадчыкам адзелаў акрвыканкома, старшыням РВК гутарыць з сакратарамі акругкома без яго ведама.

Такія, па сутнасці антыпартыйныя паводзіны Дубіны, не сустралі рашучага адпору з боку бюро акругкома і яго сакратароў. Шкадуючы самалюбасць Дубіны, бюро на працягу доўгага часу, замест жорсткай крытыкі зарваўшагася самадура, займалася ўгаварваннем яго, трацячы на гэта шмат карыснага часу для дзелавой работы. Тав. Анан'еў рабіў усё ад яго залежачае, каб пазбегнуць рашучай пастаноўкі пытання аб паводзінах Дубіны на бюро акругкома. На памылкі Дубіны, праўда, указвалася часта, але па-сямейнаму, не выносячы ніякіх рашэнняў, прычым утойваючы гэта ад членаў пленума акругкома і ад усёй партыйнай арганізацыі.

Такое гніла-ліберальнае рэагаванне на палітычныя памылкі Дубіны прывяло да паглыблення іх. Дубіна стаў на яўна антыпартыйны шлях. Ён «прызнаваў» свае памылкі, «згаджаўся» з іх крытыкай, а ўсё-ж працягваў паўтарыць і рабіць яшчэ больш сур'ёзныя. Справа даходзіла да таго, што на партыйнай групе прэзідыума акрвыканкома Дубіна браў пад сумненне рашэнні бюро акругкома партыі.

Члены пленума акругкома, акруговы партыйны актыў, які прымаў удзел у рабоце пленума, рашуча асудзілі антыпартыйныя паводзіны Дубіны. Гэты палітычна тупы і адсталы ад партыйнага жыцця чалавек быў узят пад жорсткую крытыку. Выступаўшыя таварышы на пленуме прыводзілі шмат фактаў, характарызуючых Дубіну, як палітычна-няспелага кіраўніка, грубага зажымшчыка самакрытыкі, парушальніка совецкай дэмакратыі, заўзятага вяльможу і самадура.

У сваіх выступленнях удзельнікі пленума зусім правільна ўказвалі бюро акругкома партыі, што яны, займаючыся непрабачнымі ўгаворамі Дубіны і разборам пасямейнаму гэтай справы на бюро акругкома, адцягвалі сваю ўвагу ад асноўных пытанняў партыйнага жыцця і палітычнага кіраўніцтва ўсімі галінамі работы ў акрузе. І таму невышадкова справаздачна-выбарчыя сходы адзначалі нездавальняючае кіраўніцтва акругкома первічнымі і раённымі партыйнымі арганізацыямі.

Адсутнасць вострай крытыкі і самакрытыкі ўнутры самога бюро акругкома моцна адбівалася на разгортванні крытыкі ва ўсёй акруговай партыйнай арганізацыі. Наяўнасць фактаў грубага парушэння статута партыі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі не давалі магчымасці своечасова выкрываць і знішчаць недахопы ў партыйнай рабоце. Слабая пастаноўка прапаганды і агітацыі ў масах прывяла да зніжэння ідэйнага ўзроўню асобных комуністаў, адсутнасці палітычнай чуласці і прытуплення рэвалюцыйнай пільнасці. Гэтым карысталіся ворагі, праводзячы сваю шкодніцкую работу на радзе аказаў участкаў. Ворагі доўгі час беспакарана арудвалі і ў апараце акрвыканкома. Але кіраўнік яго Дубіна займаўся антыпартыйнымі справамі, быў палітычным сляпцом і не бачыў, што рабілася ў яго апараце. Бюро акругкома таксама праяўляла палітычную бесклапотнасць, і таму несвоечасова выкрывала замаскаваўшыхся ворагаў народу.

ФРАЛОЎ.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ»

„ПАЛІТЫЧНЫЯ СЛЯПЦЫ"

Пад такім загалоўкам быў змешчан у «Звяздзе» ад 10 сакавіка г. г. артыкул, у якім указвалася на парушэнне рэвалюцыйнай законнасці ў Суражскім раёне. Як паведаміў рэдакцыі выконваючы абавязкі пракурора БССР тав. Глезераў, следствам, праведзеным Пракуратурай БССР, усе ўказаныя ў артыкуле факты палкам пацвердзіліся. Вінаватымі ў дапушчаных злоўжываннях аказаліся загадчык суражскага райфінадзела Карпенка і старшыня Янавіцкага сельсовета Кавалёў, які аддан пад суд. Справа перадана на разгляд Вярхоўнага суда БССР.

За рубяжом

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

Адна з рэспубліканскіх эскадрыляў днём 9 мая бамбардыравала казармы ў Кардове і поўнасцю разбурыла іх. Другая эскадрылля бамбардыравала завод ваеннага снаражэння. Тры бомбы, скінутыя з рэспубліканскіх самалётаў, упалі на чыгуначнай лініі, выклікаўшы вялікія разбурэнні. (БЕЛТА).

ЦЭНТРАЛЬНЫ ФРОНТ

8 мая рэспубліканскія войскі перайшлі ў наступленне на трох розных участках мадрыдскага фронта. У раёне ракі Харамы (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда) рэспубліканцы аказалі моцны націск на пазіцыі мяцежнікаў у Пералес. Падтрыманыя танкамі, рэспубліканцы занялі рад апорных мяцежнікаў і прымусілі праціўніка адступіць у некаторых пунктах больш чым на кілометр.

У Карабанчэлі (на поўдзень ад Мадрыда) рэспубліканцы занялі некалькі ўмацаваных пунктаў праціўніка.

У раёне на поўдзень ад Толедо рэспубліканцы, адбіўшы 7 мая моцную атаку мяцежнікаў, перайшлі 8 мая ў контрнаступленне, занялі вёску Архес і ўтрымалі яе, не гледзячы на контратакі мяцежнікаў. Рэспубліканская авіяцыя прымала актыўны ўдзел у гэтай аперацыі, зрабіўшы шмат палётаў у мэтах разведкі і бамбардыровак.

У сектары на поўдзень ад ракі Тахо рэспубліканскія войскі прадаўжаюць атаку і значна прасунуліся наперад. Праціўнік выцеснен з яго пазіцый і панёс цяжкія страты.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

8 мая мяцежнікі, падтрыманыя артылерыяй і авіяцыяй, прадпрынялі новыя атакі ў раёне Бермео (на паўночны ўсход ад Більбао).

На працягу ўсяго дня рэспубліканскія войскі вытрымалі моцныя баі ў раёне горнага масіва Сольюве. Праціўнік атакаваў пазіцыі рэспубліканцаў з небывалай сілай. Фашысцкая авіяцыя прадпрыняла рад палётаў над рэспубліканскай тэрыторыяй з мэтай бамбардыровак. Гарачыя баі ішлі з пераменным поспехам. У большасці выпадкаў рэспубліканцы ажыццяўлялі ўдачныя контратакі, у другіх выпадках яны аказвалі энергічнае супраціўленне моцнаму націску праціўніка.

На фронце Астурыі рэспубліканскія войскі прадпрынялі энергічную атаку ў раёне Эскампілеро і занялі важную пазіцыю мяцежнікаў. Захвачаны палонныя і куляметы.

Вымушаная пасадка рэспубліканскай эскадрыллі ў Тулузе

ПАРЫЖ, 9 мая (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас з Тулузы (горад на поўдні Францыі) эскадрылля рэспубліканскіх самалётаў у складзе 16 знішчальнікаў і аднаго транспартнага самалёта раніцою 8 мая прызямлілася на тулузскім аэрадроме. Прычына прызямлення тая, што лётчыкі, пры дрэнных атмасферных умовах, страцілі арыентыроўку і заблудзіліся. Тулузскія ўлады распарадзіліся, каб на працягу 24-х гадзін іспанскія рэспубліканскія самалёты былі праводжаны да граніцы для звароту на сваю тэрыторыю.

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 9 мая. (БЕЛТА). Іспанскія рэспубліканскія самалёты, якія спусціліся ўчора на аэрадроме ў Тулузе, вылецелі сёння назад у Барселону. Адзін самалёт, пашкоджаны пры пасадцы, астаўся на тулузскім аэрадроме. У момант адлёту іспанскі механік Гарсія цяжка ранен у правае плячо прапелерам. Самалёты суправаджала да граніцы эскадрылля французскай авіяцыі.

(Агульны лік прызямліўшыхся ўчора ў Тулузе іспанскіх самалётаў 16, а не 17, як паведамлялася раней).

СТАНОВІШЧА Ў КАТАЛОНІІ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 9 мая. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас, у Барселону (галоўны горад Каталонскай аўтаномнай вобласці) прыбылі з Валенсіі і прыступілі да выканання сваіх абавязкаў Эміліо Торэс і Хозэ Дыяс Себальос, абодва — супрацоўнікі міністэрства ўнутраных спраў Іспаніі. Эміль Торэс назначан начальнікам паліцыі Барселоны, а Себальос—генеральным камісарам барселонскай прэфектуры.

Насельніцтва цёпла сустрэла прыбыўшыя з Валенсіі 5 тысяч чалавек штурмавой гвардыі і дзве матарызаваныя роты.

У гутарцы з журналістамі глава Каталонскага ўрада Кампаніс выказаў сваё задавальненне спакоем, які зараз пануе ў Барселоне.

* * *

ПАРЫЖ, 9 мая. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас з Мадрыда, ў сталіцы Каталоніі паралак хутка аднаўляецца. Вуліцы Барселоны набылі нармальны выгляд. Адзначаецца толькі, што з наступленнем вечара вуліцы хутка пустеюць. Ва ўстановах і на заводах адновілася звычайная работа.

На адной з вуліц кавалерыйская часць рассеяла групу з некалькіх чалавек, рабіўшых выстралы з мэтаю выклікаць паніку сярод жыхароў гэтага квартала.

* * *

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзіденцыя ўрада), 9 мая. (БЕЛТА). Сёння ў Барселоне адбылося пахаванне паўшага ў часе беспарадкаў генеральнага сакратара каталонскага ўсеагульнага рабочага саюза, члена ПК аб'яднанай социялістычнай партыі Каталоніі Антоніо Сесе. Учора і сёння прапоўныя Барселоны прыехалі разам тапца з целам нябожчыка.

* * *

ВАЛЕНСІЯ, 9 мая. (БЕЛТА). Газета «Трэбаль» — орган аб'яднанай социялістычнай партыі Каталоніі — патрабуе аддання пад суд трацкістаў, справакаваўшых нядаўныя сутычкі ў Барселоне. «Нельга дапусціць, — піша газета,— каб правакатары прадаўжалі сваю падрыўную дзейнасць».

У МІЖНАРОДНЫМ КАМІТЭЦЕ ПА НЕУМЯШАННЮ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 9 мая. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у апублікаваным 7 мая паведамленні міжнароднага камітэта па неўмяшанню ў справы Іспаніі гаворыцца, што камітэт і падкамісія пры яго старшыні аднадушна прынялі рашэнне, што іх пасяджэнні павінны праводзіцца ў сакрэтным парадку. Пасля пасяджэнняў, як звычайна, будуць публікавацца паведамленні.

У апублікаваным 8 мая паведамленні аб пасяджэнні падкамісіі пры старшыні камітэта гаворыцца, што лорд Плімут унёс прапанову, каб камітэт па неўмяшанню звярнуўся з заклікам да ўрада рэспубліканскай Іспаніі і да мяцежнікаў — абодвум бакам спыніць паветраную бамбардыроўку. Усе ўдзельнікі пасяджэння падкамісіі згадзіліся прадставіць гэту прапанову на разгляд сваіх урадаў для атрымання ад іх адпаведных указанняў.

Пратэсты супроць бамбардыроўкі Гернікі

НЬЮ-ЁРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 10 мая. (БЕЛТА). Усё больш лік выдатных дзеячоў ЗША далучылі свой подпіс пад нядаўна апублікаваным пратэстам супроць бамбардыроўкі Гернікі (старадаўняй сталіцы баскаў) фашысцкімі самалётамі. Сярод падпісаўшых пратэст палітычнаедуа зараз 76 буйнейшых палітычных, грамадскіх і навуковых дзеячоў ЗША: славуты прафесар Эйнштэйн, вядомы амерыканскі ліберал Файлін, рэспубліканскі кандыдат у прэзідэнты на апошніх выбарах Лэндон, былы міністр замежных спраў ЗША Стымсон, былы міністр унутраных спраў (зараз прэзідэнт Стэнфордскага універсітэта) Вільбур, былы ваенны міністр у кабінеце Вільсона Бэйкер і інш.

* * *

НЬЮ-ЁРК, 10 мая. (БЕЛТА). У Нью-Ёрку перад будынкам германскага консульства адбылася антыфашысцкая дэманстрацыя пратэсту супроць бамбардыроўкі Гернікі. У дэманстрацыі прынялі ўдзел 2 тыс. антыфашыстаў. Сярод іх было каля 300 баскаў. Як паведамляюць з Вашынгтона (сталіцы ЗША) там перад будынкам германскага пасольства адбылася такая-ж дэманстрацыя, якая налічвала некалькі сот удзельнікаў.

„Дзень нацыянальнай ганьбы" у Кітаі

НАНКІН (сталіца Кітая), 9 мая. (БЕЛТА). Сёння ў Нанкіне адзначаецца галавіна прад'яўлення Кітаю 21 патрабавання Японіі, як «Дзень нацыянальнай ганьбы». У горадзе прыспушчаны сцягі, тэатры закрыты, забавы забаронены.

У 1915 г. у гэты дзень Кітай пад націскам Японіі даў фармальную згоду на задавальненне японскага ўльтыматума, змяшчаўшага 21 патрабаванне: уключэнне захвату японцамі Паўднёвай Манчжурыі, захвату Шанцтуна, прадастаўленне Японіі абшырных чыгуначных канцэсій у басейне рэкі Янцзы, кантролю Японіі над важнейшымі вугальнымі прадпрыемствамі Кітая, забеспячэнне спецыяльных японскіх правоў у Манчжурыі і Унутранай Манголіі і інш.

РАЗВІТАЛЬНЫ БАНКЕТ У ГОНАР тав. ЮРЭНЕВА

ТОКІО (сталіца Японіі), 8 мая. (БЕЛТА). У сувязі з маючым быць ад'ездам паўпраўнамоцнага таварыства СССР т. Юрэнева з Японіі, япона-совецкае таварыства «Ніпыро Кіокай» наладзіла сёння ў яго гонар развітальны банкет. На банкеце прысутнічала каля 100 прадстаўнікоў палітычнага і дзелавога свету, друку, а таксама аказвыя супрацоўнікі совецкага паўпраўства і ганцлёнага прадстаўніцтва.

Выступіўшы з прывітальнай прамовай старшыня таварыства адмірал Като Кандзі выказаў тав. Юрэневу «ўдзячнасць ад таварыства за тое, што Юрэнеў на працягу чатырохгаловага пробывання на пасту сваёй паўправы ў Японіі безупынна прыкладаў усе намаганні для развіцця прыязных і эканамічных адносін паміж СССР і Японіяй, а таксама да развіцця культурнай сувязі паміж двума гэтымі краінамі». Като Кандзі таксама адзначыў, што «Юрэнеў прымаў дзейны ўдзел у работах канферэнцыі па продажу КУЧ, якая завяршылася бліскучым поспехам».

ВЫХОЎВАЦЬ НОВЫЯ, УЗРОСШЫЯ ПАРТЫЙНЫЯ КАДРЫ

Справаздачы і выбары партыйных органаў — парткомаў, парторгаў, первічных партарганізацый у Аршанскай партарганізацыі праходзяць пры небывалай актыўнасці комуністаў.

Дастаткова прывесці, для наглядзнасці, колькасць выступаўшых у спрэчках па справаздачах сакратароў парткомаў і парторгаў. У партыйнай арганізацыі завода «Чырвоны барацьбіт» з 11 прысутнічаўшых выступалі ўсе; у партыйнай арганізацыі паравознага дэпо з 78 па справаздачы выступіла 40; у партыйнай арганізацыі мясакамбіната з 31 выступіла 22; на булаўніцтве ільнокамбіната з 29 выступіла 26; на хлебакамбінаце з 17 выступілі ўсе і т. д.

Але галоўнае, каштоўнае ў гэтай актыўнасці — не колькасць выступленняў, а змест, якасць абмеркавання работы партыйных камітэтаў, партыйных арганізатараў і высоўваемых кандыдатур у склад парторганаў.

У партыйнай арганізацыі хлебакамбіната выступаўшыя таварышы з усёй рашучасцю адзначалі выключную запушчанасць партыйна-палітычнай работы. Масава-палітычная работа абмяжоўваецца мітынгамі; палітінфарматары і агітатары нічога не робяць, а прыклад бязрэйнасці паказваюць у гэтых адносінах самі кіраўнікі. Сакратар парткома Шаўдоў, дырэктар камбіната Слонім, дырэктары хлебазаводаў Дрознік, Даніленка, старшыня заўкома Французаў самі, будучы прымапаванымі да брыгад, як агітатары, ніякай работы не вялуць.

Члены і кандыдаты партыі партыйнай арганізацыі паравознага дэпо Іваноў А., Жуковіч В., Лагойскі, Шашкоў, Станулёс і іншыя ўскрывалі недахопы работы парткома і сакратара парткома Давідзюка, указвалі на фармальныя адносіны парткома ў кіраўніцтве работай палітшкол, пахавых агітатараў і на адсутнасць канкрэтнай дапамогі гэтым агітатарам. Напрыклад, т. Станулёс у сваім выступленні сказаў: «Я з'яўляюся чытчыкам газет, але са мной ні аднаго разу ніхто яшчэ не гаварыў, не накіроўваў маю работу». А т. Лагойскі, нібы прадаўжаючы гэту мысль, гаворыць: «Тав. Давідзюк увесь час адседжваўся ў кабінеце. Я—групарторг, і да мяне Давідзюк ні разу не прыходзіў у цэх пагутарыць; а ўжо аб гутарках з рабочымі і гаварыць не прыходзіцца».

Вялікая актыўнасць, разгортванне большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі на справаздачна-выбарчых сходах узнімаюць вышэй рэвалюцыйную пільнасць комуністаў. Гэта дало магчымасць на справаздачна-выбарчым сходзе партарганізацыі вагоннага дэпо ўскрыць злачынную практыку ашуканства дзяржавы і партыі, грубае рочкаўпірацельства, мяжуючае са шкодніцтвам, з боку начальніка вагоннага ўчастка члена партыі Рахубенкі і начальніка вагонарамонтнага пункта Савінкага. На сходзе выяўлена, што яны правадзілі яўна антыдзяржаўную практыку, складаючы хлуслівыя данясенні кіраўніцтву дарогі аб выкананні дзяржаўных заданняў.

Партыйным сходам выяўлены былі наступныя факты.

Намеснік начальніка вагоннага ўчастка т. Галуленка старшынствуе на партыйным сходзе, на якім распрапоўваліся матэрыялы лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б). У гэты час ён атрымлівае ад начальніка вагоннага ўчастка члена партыі Рахубенкі запіску. Вось яе змест.

«Калі ты яшчэ тут пасядзіш адну гадзіну, або нават менш, то крыміналышчыны не мінаваць, намечаная работа не робіцца; а гэта ўжо не да крытыкі. Неадкладна згортвайся і зрабі ўсю намечаную работу, хапя гэта будзе да раніцы».

Што азначае гэта зашыфраваная запіска? Вось яе сімвал, як гэта расшыфравана на справаздачным партыйным сходзе. Да пачатку партыйнага схода, які распрапоўваў рашэнні Пленума ЦК ВКП(б), з Масквы прыбыў інспектар для праверкі вагоннага дэпо. І вось інспектар пачынае правяраць дэпо капітальнага рамонту. Што рабіць? Нехапае 90 вагонаў, на якія далі весткі, што яны выпушчаны з капітальнага рамонту. Вочкаўпірацелі хутка вырашылі гэту задачу. Але якім шляхам? — Вочкаўпірацельства прыкрыць дадатковым вочкаўпірацельствам, г. зн. перакаціць вагоны з дэпо бягучага рамонту ў дэпо капітальнага рамонту і паказаць вагоны бягучага рамонту, як вагоны, вышаўшыя з капітальнага рамонту. Ну, а калі выпадкова інспектар захоча праверыць дэпо бягучага рамонту, — тады зноў перакаціць тыя-ж вагоны ў дэпо бягучага рамонту.

Пры ўсёй гэтай махінацыі ўсё-ж нехапіла 20 вагонаў. Што робяць вочкаўпірацелі? Яны хутка спраўляюцца і з гэтай задачай. Рашаюць прапаваць усю ноч, даць прытулак інспектару для начлегу і, пакуль інспектар будзе спаць, за ноч наставіць каробкі вагонаў на-халу; часова іх прымацаваць і, у выпадку выяўлення, вышаць гэтыя вагоны як няскончаны капітальны рамонт, — моў, выбачайце, трохі недарабілі, усяго на пару дзён работы—і «маленькая» памылка будзе выпраўлена.

Але жулікі да канца выкрыты на справаздачна-выбарчым сходзе комуністамі дэпо.

Такія, па сутнасці, шкодніцкія, антыдзяржаўныя дзеянні маглі мець месца толькі таму, што там існавала групаўшчына, сямейственасць, падхалімства, узаемнае пакрыванне злачынстваў. І ўсё гэта ўзнята, выкрыта было смелай большэвіцкай крытыкай комуністаў на партыйным сходзе.

Пастановай агульнага партыйнага схода начальнік вагоннага ўчастка Рахубенка быў выключан з радоў партыі.

Суровую ацэнку партыйны сход даў рабоце парткома і сакратара т. Мікуліча за праяўленую імі палітычную слепату, за ўсыпленне пільнасці комуністаў.

На справаздачна-выбарчых сходах былі ўскрыты факты грубейшага запіску крытыкі і самакрытыкі, наяўнасць падхалімства, угодніцтва, сямейственасці, меўшых месца ў партыйных арганізацыях хлебакамбіната, завода «Чырвоны Кастрычнік» і мясакамбіната.

Тайныя выбары ўзнялі пачуццё адказнасці, уласнай годнасці кожнага члена партыі. Новыя парткомы выбіраюць з вялікай адказнасцю. Абмеркаванне кандыдатур у партыйныя органы—партыйная камітэты, партыйных арганізатараў праходзіць актыўна. Дастаткова сказаць, што па 25 арганізацыях з намечаных у спісах 117 кандыдатаў у рэзультаце абмеркавання было адведзена 45 чалавек. Калі раней выбіралі па становішчу, займаемаму ў прадпрыемстве, то зараз падыходзяць выключна з пункту погляду таго, як даны комуніст здолен ажыццяўляць кіраўніцтва партыйнай арганізацыяй.

Дырэктар мясакамбіната Васільеў на мыслі інакш, і гэта было нібы ўзаконеным, што ён павінен быць у складзе парткома. Зараз-жа, пры новых выбарах, Васільеў не быў нават унесен у спіс кандыдатур для абмеркавання. Тое-ж атрымалася і з дырэктарам хлебакамбіната Слонімам.

Партыйныя камітэты выбраны з лепшых, праверaных партарганізацыямі таварышоў.

Выбары паказваюць, якія новыя, вырасшыя кадры мае раённая партыйная арганізацыя. Па папярэдніх даных, у 9 парткомах 3 сакратары парткомаў і 20 членаў парткомаў з колькасці нанава выбраных 43 членаў выбраны ўпершыню; у 33 первічных партарганізацыях 8 парторгаў выбраны таксама ўпершыню.

Зусім правільна крытыкуюць раённы камітэт за тое, што ён, захапіўшыся гаспадарчай работай на вёсны, надзвычай слаба ўдзяляў увагу непасрэднаму кіраўніцтву і разгортванню партыйна-палітычнай работы ў партыйнай арганізацыі. Гэта крытыка, безумоўна, з'яўляецца правільнай.

Але трэба сказаць, што разгорнутая крытыка і самакрытыка на справаздачна-выбарчых сходах ёсць толькі пачатак. Задача раённага камітэта іменна ў тым, каб мабілізаваць усю партыйную арганізацыю і накіраваць разгорнутую крытыку і самакрытыку на сапраўднае выкараненне ўсіх недахопаў і прарываў у партыйнай, палітычнай і гаспадарчай работе; на ўзмацненне рэвалюцыйнай пільнасці і выкрыццё ўсіх, без астатку, пасялешчаў контррэвалюцыйнага трацкізма, — агентаў японска-германскага фашызма і іх пасобнікаў — правых, рэстаўратараў капіталізма.

Р. СОСКІН.

Сакратар Аршанскага райкома партыі.

ЗАБЫТЫЯ ШКОЛЫ

Не так даўно пяць настаўнікаў пажарышчынскай НСШ, Бешанковіцкага раёна, падалі старшыні сельсовета заяву: Яны пісалі, што дырэктар школы Белаусава і яе муж Лысенка, былы старшыня сельсовета, выключаны з партыі ў часе абмену партыйных білетаў, вядуць варожую работу супроць настаўніцкага калектыва. Гэта заява трапіла да загачыка райана тав. Кнышава, а ён, замест таго, каб заняцца вывучэннем школы, праверыць заяву, проста правёў сход настаўнікаў, пагаварыў і на гэтым палічыў сваю работу скончанай.

А на самай справе ў пажарышчынскай школе не ўсё добра. Для дзяцей не створаны самыя элементарныя ўмовы для вучобы. Зімой былі дні, калі тэмпература ў класах была 3—4 граўсы, і вучні сядзелі ў паліто і пальчатках. У класах няма чарнільніц, ручак, няма гатаванай вады.

З непасяховасцю ніхто ў школе не змагаецца, а дырэктар школы наогул не зварачвае на гэта ўвагу. Невыпадкова, што ў большасці класаў непасяховасць дасягае 20—30 проц.

Паміж настаўнікамі і дырэктарам Белаусавай існуюць вельмі нездаровыя адносіны. Аб якой-бы там ні было крытыцы і самакрытыцы не можа быць і гутаркі. І калі хто-небудзь з настаўнікаў правільна ўказвае Белаусавай на яе недахопы, на развал школы, то яго пачынаюць травіць Белаусава і яе муж Лысенка. Апошні, карыстаючыся тым, што настаўнікі знаходзяцца на занятках, урываецца ў іх кватэры, капаецца ў іх рэчах, потым распускае розныя кампраметуючыя чуткі. Такім чынам ім была знойдзена на кватэры Кавалеўскага копія допісу ў газету «Звязда» аб школе і Белаусавай. Гэта яшчэ больш узгнявіла Лысенку і яго жонку супроць Кавалеўскага.

***

У супроцьлеглым канцы раёна знаходзіцца хоцімская нясоўная сярэдняя школа. У гэтую школу таксама рэдка заглядваюць з райана. А становішча школы прымушае біць трывогу.

Новы навучальны год школа пачала ў ненадрыхтаваным памяшканні. Два класы знаходзяцца на адлегласці поўкілометра ад школы. Чацверты клас займаецца ў адным пакоі з сям'ёй калгасніка, у якога ёсць малое дзіця. Гэта ў той час, калі побач са школай стаіць добры дом, у якім жыве вартаўнік школы. У памяшканнях школы панае антысанітарыя.

Настаўніцкі калектыў вельмі ажыўся з гэтым. Настаўнікі прытрымліваюцца прыказкі: «смецце з хаты не выносіць». І таму ўсё агіднае, усё дрэннае рысуецца імі ў самых прыгожых фарбах. Сямейственасць прыняла да таго, што дырэктар школы Балтушкін скарыстоўвае школьную маёмасць у сваіх уласных мэтах. Як устанавіла рэвізійная камісія РВК, Балтушкін прысвоіў з касы школы 560 рублёў.

На вучняў тут ніхто не зварачвае ўвагі, і яны прадастаўлены самі сабе. Піонерская работа адсутнічае.

Загачык райана Кнышаў не ведае, чым жывуць школы, як яны працуюць. Ён амаль ніколі не бывае ў школах. Таму атрымоўваецца, што значная частка настаўніцкіх кадраў засмечана варожымі людзьмі. У раёне аб гэтым добра ведаюць, а вось прыглядзецца да гэтых людзей, праверыць іх ніхто не думае.

Мы ўправе патрабаваць ад кіраўнікоў Бешанковіцкага раёна і ад Наркомасветы неадкладнага палепшання кіраўніцтва школамі.

М. МЕЛЬЦЫН.

ЗГРАЯ ЗЛАЧЫНЦАЎ

4 сакавіка г. г. быў для мяне днём вялікай радасці—агульным сходам калгаснікаў я была прынята ў калгас імя «Праўды» Глівенскага сельсовета, Барысаўскага раёна. Але нядоўта цягнуліся радасныя дні. 16 сакавіка на месца былога старшыні калгаса Бусло старшынёй калгаса быў выбран Бабіцкі.

І вось Бабіцкі з першых дзён сваёй дзейнасці старшынёй калгаса пачаў здзекавацца наша мной за тое, што мой муж у 1929 і 1930 гг., будучы членам сельсовета, прымаў удзел у ліквідацыі кулацтва, як класа. А сярод кулакоў былі сваякі Бабіцкага.

Вось факты. 10 красавіка Бабіцкі прыехаў з брыгадай калгаснікаў і засеяў мой прысядзібны ўчастак. Я пачала пратэставаць супроць незаконных дзеянняў, і прасіла пакінуць мне ўстаноўленую норму, згодна сталінскага статута сельгасарцелі, 0,30 гектара для прысядзібнага ўчастка. Тут-жа ён загадаў калгаснікам пабіць мяне.

Гэта зграя прыхільнікаў Бабіцкага—член праўлення Зарэмба, Кот і іншыя — збілі мяне палкамі.

11 красавіка я прыйшла да старшыні калгаса прасіць аб выдзяленні прысядзібнага ўчастка, але ён нават і слухаць не хацеў і з крыкам заявіў:

— Вон адсюль, ніякай зямлі я табе не дам. Я сёння выключу цябе з калгаса.

Вечарам быў склікан сход калгаснікаў, на якім прысутнічала 139 чалавек; за выключэнне мяне з калгаса галасавалі толькі 22 чалавекі. Не гледзячы на гэта, Бабіцкі ўсё-ж абвясціў рашэнне правамоцным.

Больш дэкады ўжо я абіваю парогі сельсовета і райвыканкома, але дарэмна, я нічога так і не дабілася.

Даведаўшыся, што я хадзіла скарджыцца ў райвыканком і сельсовет, 18 красавіка ўначы Бабіцкі, яго намеснік Уклейка, член Глівенскага сельсовета, і член праўлення калгаса Кот уварваліся п'яныя ў хату і пачалі рабіць вобыск. Пагражалі мне, пратрэслі і парасхідалі ўсё, што было ў хаце. Нарэшце забралі 218 рублёў грошай і на 300 руб. пазыкі.

БАБІЦКАЯ А. А.

АД РЭДАКЦЫІ: Мы звяртаем увагу Пракуратуры рэспублікі на факты абураючых злачынстваў у калгасе «Правда», Барысаўскага раёна. Па гэтай справе павінна быць тэрмінова праведзена следства. Злачынцаў і іх абаронцаў трэба прыцягнуць да адказнасці.

ГЛУШЫЦЕЛІ КРЫТЫКІ

У рэдакцыю раённай газеты «Калгаснік Уздзеншчыны» не адзін раз пісалі аб буйнейшых недахопах і прамым злоўжыванні ў калгасе «Полымя», Уздзенскага раёна. Старшыня калгаса т. Пунач Кастусь спіўся з групай калгаснікаў і разам з імі займаецца распягваннем калгаснай маёмасці.

Да шматлікіх сігналаў з калгаса газета адносіцца па заведзенай у яе традыцыі,—ўсе пісьмы накіроўваюцца для «расследвання і разгавання» ў райземаддзел. Далейшы лёс пісем газету нікольні не цікавіць...

У уздзенскім райземаддзеле праверку пісем даручылі статыстыку Шыдлоўскай. Яна прышла ў калгас, звярнулася да старшыні калгаса, аб злоўжываннях якога пісалася, а ён, прачытаўшы ў арыгінале пісьмо, доўга не думаючы, напісаў на ім рэзалюцыю, што факты не пацвярджаюцца. Гэта палкам задаволіла т. Шыдлоўскую. Яна, больш ні з кім нават не пагутарыўшы, вярнулася ў раён, палічыўшы справу вырашанай.

Такім-жа метадам і дакладна з такой-жа стараннасцю расследваў пісьмы ў гэтым калгасе і інструктар раённага камітэта КП(б)Б т. Лейзаровіч.

С. ПЫРАШЭЎСКІ.

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ ТРЭЦЯГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА

Смялей разгортваць геолагаразведчую справу!

Інжынер А. РОЗІН

Дырэктыва XVI партыйнага з'езда абавязала геолагаразведчую службу павярнуцца тварам да абслугоўвання патрэб народнай гаспадаркі. Аднак, за апошнія гады ў БССР было вельмі мала зроблена для выяўлення новых месцанараджэнняў мінеральных багаццяў рэспублікі. Даволі прыкладна прыклад ліквідацыі ў 1933 годзе Белгеоразведкі і звядзенне з гэтым скарачэнне размаху геолагаразведчых работ. Пошукавыя, а таксама геафізічныя разведкі, якія вяліся шырокім фронтам да 1933 года, былі спынены.

Толькі ў 1936 годзе зноў пачынае адраджацца, але вельмі павольна, геолагаразведчая справа. Групай разведак Навукова - даследчага інстытута прамысловасці праведзена дэталёвая разведка глін Ляхавай гары для арганізацыі вытворчасці каналізацыйных труб, агнетрывалай і тугаплаўкай цэглы, пачата і ў значнай ступені праведзена работа па вышукванню сыравіны для новага цементнага завода ў БССР, праводзяцца даследчыя работы па тугаплаўкіх глінах недалёка ад Хэцінава, Слуцкай акругі, закладваецца пірафілітавая шахта і рад іншых работ.

Інстытутам геалогіі Акадэміі навук Беларусі працягваюцца пачатыя яшчэ былой Белгеоразведкай работы па доследах высокаякасных кварцавых пяскоў ля пасёлка Салаўёва, Лоеўскага раёна. Арганізацыя ў канцы 1936 года Геолагаразведчага кіраўніцтва Наркамляспрома БССР дала магчымасць закончыць усе гэтыя работы, а таксама даць монаграфію, якая высвятляе пытанне аб жалезных рудах у БССР і магчымасці іх выкарыстання ў народнай гаспадарцы рэспублікі.

Сёлета ўжо намечаны буйныя геафізічныя разведчыя работы па вывучэнню глыбінных нетраў і магчымых карысных выкапняў (жалезная руда, соль, вугаль, нафта, газа і інш.), па выяўленню і разведцы каменных, будаўнічых і дэкаратыўна-аблiцовачных матэрыялаў, керамічнай сыравіны для цэглы, чарапіцы, каналізацыйных труб, метлахскіх плітак, фарбавай і абразіўнай сыравіны, сыравіны для шапны, сілікатнай цэглы і інш. Да выканання гэтых работ ужо прыступілі.

Многа яшчэ нявывучаных і нявыяўленых месцанараджэнняў мінеральнай сыравіны на глыбіні да 20—30 метраў, а то і 5—8 метраў, якія дагэтуль служылі аб'ектам горнай эксплаатацыі. Асабліва вельмі мала зроблена ў галіне вывучэння ніжэйляжачай тоўшчы літасферы і глыбінных нетраў.

Важныя і практычныя задачы, істотныя патрабаванні трэцяй і наступных пяцігодак высоўваюць пытанне: ці дастаткова багаты нетры бліжэйшай тоўшчы мінеральнай сыравінай, каб задаволіць патрэбнасці нашай народнай гаспадаркі і абароны краіны?

Калі аб бліжэйшай тоўшчы зямлі, адкуль мы чэрпаем неабходныя нам гліны, крэйды, даламіты, пяскі, трэпелы, красачныя землі і руды, фасфарыты, торф і інш., у нас ёсць, хаця і няпоўны, але ўсё-ж багаты матэрыял, які накапіўся з 1927 года як па раённых, так і па асобных месцанараджэннях, то што датычыць вывучэння глыбокай тоўшчы зямлі, глыбіннай геалогіі, — мы пастаўлены ў зусім іншыя ўмовы. З-за адсутнасці фактычнага матэрыялу мы прымушаны высоўваць пэўны прагноз і гіпатэтычныя вывады.

Вывучэнне глыбінных нетраў не толькі геафізічнымі метадамі, але і глыбокімі скважынамі ў суседніх з БССР абласцях УССР і РСФСР прывялі да вельмі цікавых і на першы погляд нечаканых вынікаў. У Рамах і іншых мясцовасцях у непасрэднай блізасці да БССР знойдзена нафта, саляныя купалы.

У гэтым блізкім да БССР раёне выяўлены ў межах Паўночна-украінскай упадзіны нафтавыя структуры. Недалёка ад БССР, можна сказаць ля варот нашай рэспублікі, выкрысталізоўваецца раён па структурных сувязях, які мае многа сходных рысаў з другой нафтавай базай Саюза—Урала-Эмбінскім раёнам. Ёсць падстава меркаваць, што салянанафтавыя структуры ёсць ў межах Паўночна-украінскай мульды (упадзіны) у паўднёвай і паўднёва-ўсходняй частках БССР, пачынаючы, прыкладна, ад раёна Бабруйска—Жлобіна — Палесся — Оўруча.

Выяўлен у Заходняй вобласці рад буйных магнітных анамалій, з якімі, магчыма, звязаны магутныя жалезарудныя тоўшчы на глыбіні. Працягласць гэтай групы анамалій ў баку Курскай магнітнай анамаліі, дзе ўжо ў шахце імя акадэміка Губкіна выдаецца жалезная руда, і, нарэшце, магчымая сувязь гэтых анамалій з магнітнымі анамаліямі, хаця і слабымі, ўжо выяўленымі ў БССР у раёне Віцебск—Невель і ў раёне Барысаў — Чэрвень, гаворыць аб магчымасці жалезарудных скапленняў і ў БССР.

Адначасова з гэтым магчымы спрыяючыя газаносныя структуры (прамысловыя прыродныя газы) у межах паўночнай і заходняй частак БССР; можна меркаваць і аб скапленні расолаў і магчыма каменнай солі, а таксама пластоў мяручых сланцаў і ў глыбокіх нетрах.

Усе гэтыя меркаванні аб магчымасці залягання ў глыбокіх нетрах нашай рэспублікі каштоўных і карысных выкапняў поўнасцю абвяргаць школьную тэорыю аб беднасці глыбокіх нетраў БССР.

У трэцяй пяцігодцы патрэбна смела, узмоцненымі тэмпамі разгарнуць геолагаразведчыя работы, якія ўзбагацяць нашу краіну новымі каштоўнымі матэрыяламі і сыравінай для дальнейшага развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі.

Дзяўчаты—рацыяналізатары і вынаходнікі. Глазіроўшчыца цукерак адэскай кандытарскай фабрыкі імя Розы Люксембург Фіра Сямёнаўна Шварцман дала каля 20 рацыяналізатарскіх прапаноў. Паяльшчыца банак тіраспольскага кансервавага завода імя Першага мая, цяпер брыгадзір цэха, Ксенія Рыгораўна Якубоўская, рацыяналізаўшы вытворчы працэс, паставіла ўсесаюзны рэкорд (5.100 кансервавых банак за змену). Тэхнік адэскай джутавай фабрыкі комсамолка Валенціна Рыгораўна Руднік, рацыяналізаваўшы ткацкі станок і замяніўшы дэфіцытныя скураныя пракладкі фібравымі, дабілася вялікай эканоміі. НА ЗДЫМКУ (злева направа): тт. Шварцман, Якубоўская і Руднік. Фото А. Іоселевіча (СФ).

У ДЗЯРЖПЛАНЕ І НАРКАМАТАХ БССР

У Дзяржплане

Падрыхтоўчая работа па складанню трэцяга пяцігадовага плана распачата Дзяржпланам ужо даўно. Рад асноўных пытанняў ужо распрацаван. Так, напрыклад, закончана прапрацоўка пытання аб развіцці ільняной прамысловасці Беларусі. Рад тэм распрацаван Акадэміяй навук БССР і навукова-даследчымі інстытутамі.

Цяпер у аддзелах Дзяржплана падводзяцца папярэднія вынікі другой пяцігодкі. Выяўляюцца магчымасці развіцця народнай гаспадаркі і складаюцца намёткі плана трэцяй пяцігодкі. Галоўным чынам работа сканцентравана на складанні балансаў: апалу, электраэнергетыкі і сыравіны.

У Наркаммясцпроме

4 мая Наркаммясцпром БССР даў указанне ўсім трэстам прыступіць да падвядзення папярэдніх вынікаў другой пяцігодкі, складання праектаў трэцяга пяцігадовага плана і эканамічнага абгрунтавання развіцця галін прамысловасці.

Па папярэдніх намётках, вызначаецца асабліва хуткі рост тарфяной прамысловасці, металапырспажыву, прамысловасці вяжучых матэрыялаў (цэмент, вапна), чарапічнай і аддзелачных будаўнічых матэрыялаў. Рост здабычы торфу па прадпрыемствах мясцовай прамысловасці арыентыровачна намячаецца ў 3,6 —3,7 разоў.

14—16 мая наркамат будзе праводзіць нарады па галінах прамысловасці, на якіх будуць абмяркоўвацца папярэднія паказальнікі планаў, выпрацаваных трэстамі.

Трэба адзначыць, што ў рабоце планавага аддзела наркамата адчуваецца няўпэўненасць у рабоце. Яна выклікана тым, што тут прыступілі да складання плана, не маючы пэўных установак. Плануючы, напрыклад, развіццё тарфяной і цагельнай прамысловасці, Наркаммясцпром не мае ніякіх даных аб размерах планавай патрэбнасці гэтай прадукцыі ў трэцяй пяцігодцы.

У Наркамхарчпроме

3 мая ў Наркамаце харчовай прамысловасці адбылася нарада дырэктароў трэстаў і прадпрыемстваў, дзе былі дадзены ўказанні аб прыступленні да складання плана трэцяй пяцігодкі. Для гэтай работы прыцягваюцца ўсе навукова-тэхнічныя сілы.

Навукова - даследчы інстытут харчовай прамысловасці заканчвае падвядзенне вынікаў работы раду важнейшых галін прамысловасці ў другой пяцігодцы.

У канцы мая, калі ўжо будуць гатовы папярэднія намёткі плана, намечана склікаць шырокі актыў работнікаў харчовай прамысловасці з удзелам стаханаўцаў-рабочых, дзе будуць абмяркоўвацца распрацаваныя матэрыялы. У гэты-ж час будзе разгорнута масавае абмеркаванне складзеных планаў на прадпрыемствах.

Асноўнае накіраванне ў далейшым развіцці харчовай прамысловасці рэспублікі ў трэцяй пяцігодцы надаецца тым галінам, якія базіруюцца на мясцовай сыравіне (піваварная прамысловасць, крахмальна-патачная, плода - перапрацоўчая, халадзільная гаспадарка і інш.).

Асабліва максімальнае развіццё атрымае раённая пізавая прамысловасць (каўбасныя цэхі, булачныя майстэрні, дробныя прадпрыемствы для выпрацоўкі безалкагольных напіткаў, фруктовыя заводы і інш.).

Аб формах уласнасці ў СССР

Э. КВІРЫНГ

Намеснік старшыні Дзяржплана СССР

Усе буржуазныя канстытуцыі заснаваны на непахіснасці права прыватнай капіталістычнай уласнасці, бо прыватная ўласнасць з'яўляецца краевугольным камнем эканамічнай базы буржуазнага грамадства.

Карэннае адрозненне нашай Канстытуцыі ад усіх буржуазных канстытуцый заключаецца ў тым, што эканамічнай асновай яе з'яўляецца **соцыялістычная сістэма гаспадаркі і соцыялістычная ўласнасць** на прылады і сродкі вытворчасці. Гэтым палажэннем Сталінская Канстытуцыя замацоўвае той факт, што эксплаататарскія класы і капіталістычная ўласнасць у нашай краіне ліквідаваны і соцыялістычная сістэма з'яўляецца асновай нашай гаспадаркі. Канстытуцыя тым самым не дапускае існавання ў нашай краіне капіталістычнай уласнасці і эксплаатацыі чалавека чалавекам.

Сталінская Канстытуцыя, якая фіксіруе ўжо дасягнутыя поспехі ў будаўніцтве соцыялізма, устанаўлівае дзве формы соцыялістычнай уласнасці: уласнасць дзяржаўную (усенародная дастаянне) і ўласнасць калгасна-кааператыўную (уласнасць асобных калгасаў, кааператыўных аб'яднанняў). Разам з тым, Канстытуцыя ўстанаўляе, што побач з соцыялістычнай формай уласнасці, якая з'яўляецца адзіна пануючай формай гаспадаркі, у СССР дапускаецца дробная прыватная гаспадарка адназасобных сялян і саматужнікаў, заснаваная на асабістай працы і выключаючая эксплаатацыю чужой працы. Канстытуцыяй ахоўваюцца правы і асабістай уласнасці грамадзян на іх працоўныя даходы, зберажэнні, на жылыя дамы і падсобныя гаспадаркі, на прадметы хатняга і гаспадарчага ўжытку і прадметы асабістага спажывання і выгоды.

Ці можна было раней фіксіраваць у Совецкай Канстытуцыі ўсё гэта так, як запісана ў новай Канстытуцыі? «Дэкларацыі правоў працоўнага і эксплаатуемага народу», якая была прынята ў пачатку 1918 года, у першай Канстытуцыі РСФСР і потым у Канстытуцыі Совецкага Саюза, прынятай у 1924 годзе, яшчэ нельга было фармуляваць падобным чынам вызначэнне ўласнасці. Відома, і ў той перыяд соцыялістычная ўласнасць была вядучай у народнай гаспадарцы. Аднак тады існавалі яшчэ капіталістычныя прамысловыя прадпрыемствы, існавалі яшчэ кулацкія гаспадаркі, эксплаатаваўшыя чужую працу, быў і прыватны гандаль. Словам, існаваў яшчэ даволі моцны прыватна-капіталістычны сектар. У сельскай гаспадарцы пераважалі адназасобныя дробныя таварныя сялянскія гаспадаркі.

Перамога соцыялістычнай уласнасці ў СССР дасягнута ў разлютаванай класавай барацьбе. Партыя, разграміўшы правых здраднікаў і контрэвалюцыйных трацкістаў, ператварыўшыхся ў прамую агентуру фашызма, галоўнай задачай якіх з'яўляецца аднаўленне ў нашай краіне капіталізма, ажыццявіла ліквідацыю капіталістычных класаў і ў рэзультаце разлютаванай класавай барацьбы забяспечыла канчатковую перамогу соцыялізма.

Капіталістычная ўласнасць на зямлю, на чыгункі і банкі была поўнасцю ліквідавана ў першыя-ж месяцы існавання совецкай улады. Буйная прамысловасць была нацыяналізавана амаль поўнасцю ў 1918—1920 гг. Але капіталістычныя элементы ў прамысловасці яшчэ аставаліся—яны ліквідаваліся паступова. У 1920 г. прыватны капітал меў у сваіх руках 26,6 проц. прадукцыі ўсёй прамысловасці, а ў 1925—1926 гг. каля 15 проц. За перыяд першай пяцігодкі адбываўся працэс разкай і быстрай ліквідацыі капіталістычных элементаў у прамысловасці, і ў 1930 годзе доля прыватнага капітала ў выпуску прадукцыі складала ўжо толькі 0,1 проц.

Даволі доўга трымаўся прыватны капітал у гандлі. У 1922—1923 гг. ён ахапляў 75 проц. усяго рознічнага абароту, у 1926—1927 гг. — 37 проц. У 1929—1930 гг., г. зн. у перыяд разгорнутага наступлення на капіталістычныя элементы па ўсяму фронту, гэты процант упаў да 6—7, а ў наступны 1931 і 1932 гг. прыватны капітал і ў галіне гандлю быў поўнасцю ліквідаван.

У сельскай гаспадарцы ў гэтыя-ж гады таксама паспяхова была праведзена ліквідацыя кулацтва як класа на базе суцэльнай калектывізацыі. У 1928 г. калгасы ахаплялі ўсяго 1,7 проц. сялянскіх гаспадарак, у 1932 г. было ахоплена ўжо 61,5 проц., на 1 красавіка 1936 г. — 89 проц., а на 1 студзеня 1937 г. — 92 проц. **Усё гэта гаворыць аб поўнай перамозе соцыялізма ва ўсіх галінах нашай гаспадаркі.** Побач з канчатковай перамогай соцыялістычнай формай уласнасці на сродкі і прылады вытворчасці захаваліся толькі індывідуальныя адназасобныя сялянскія гаспадаркі, адпіснутыя на другарадныя пазіцыі, і дробныя саматужнікі, не эксплаатуючыя чужой працы і не ўяўляючыя колькі-небудзь сур'ёзнай эканамічнай сілы.

У чым-жа розніца паміж двума формамі соцыялістычнай уласнасці — дзяржаўнай і кааператыўна-калгаснай? **Абедзве гэтыя формы ўласнасці соцыялістычнай,** але ў адным выпадку калектыўным уласнікам з'яўляецца **дзяржава ў цэлым,** а ў другім — групы калгаснікаў або саматужнікаў, аб'яднаных на аснове статута ў сельскагаспадарчыя або прамысловыя арцелі. Пры гэтым трэба асоба адзначыць, што зямля, на якой працуюць калгасы, з'яўляецца **агульнанародным дастаяннем,** яна належыць **дзяржаве,** а не ўяўляе ўласнасці калгасаў або іншых форм аб'яднання працоўных. Апрача таго, асноўныя сродкі вытворчасці, апрацоўваючыя палі калгаснікаў (трактары, камбайны), таксама з'яўляюцца дзяржаўнай уласнасцю. За карыстанне машынамі МТС калгасы плацяць Совецкай дзяржаве ў залежнасці ад фактычнай апрацоўкі і ўборкі калгасных палёў. Дзяржава планіруе калгасную вытворчасць: пасеўныя плошчы, ураджайнасць, развіццё жывёлагадоўлі і т. д. Аднак, у межах дзяржаўнага плана, на аснове статута, кожны асобны калгас у асобе свайго агульнага схода або, у поўных выпадках, у асобе праўлення, самастойна рашае пытанні гаспадарчага развіцця дагнага калгаса. Па выкананні вызначаемых дзяржавай абавязацельстваў калгас, на аснове статута, свабодна распараджаецца сваёй прадукцыяй. Частка яе можа быць вылучана для свабоднага продажу дзяржаве або на калгасным рынку. Калгас з'яўляецца поўным гаспадаром свайго прыбытку. Дзяржава не можа перадаваць прыбытак аднаго калгаса другому калгасу, саўгасу або якому-небудзь іншаму прадпрыемству. Даходы калгаснікаў — гэта матэрыяльныя вынікі работы калгаса, якія ў залежнасці ад агульнага ўзроўню гаспадарання калгаса і работы кожнага калгасніка **размяркоўваюцца па працаднях, а не на аснове зарплаты.**

У адносінах прадпрыемстваў дзяржаўных (фабрыка, завод, саўгас, МТС і т. д.) урад, у планавым парадку, поўнасцю размяркоўвае і прадукцыю, і прыбытак, і ўсе сродкі прадпрыемства. Рабочыя атрымліваюць **зарплату** ў залежнасці ад колькасці і якасці затрачанай працы, ад рэзультатаў работы.

Са сказанага відаць асноўнае адрозненне паміж уласнасцю **дзяржаўнай і калгасна-кааператыўнай,** з чаго выцякаюць і адрозненні ў аплаце працы рабочага і калгасніка (зарплата і аплата па працаднях, аб чым гаварылася вышэй).

Якая-ж удзельная вага ўласнасці **дзяржаўнай** (усенародная) і ўласнасці **калгасна-кааператыўнай** у гаспадарцы краіны? Пачнем з прамысловасці.

На 1 студзеня 1936 г. асноўныя фонды па ўсёй дзяржаўнай прамысловасці складалі 48 мільярдаў рублёў, а па саматужна-прамысловай і інвалідзнай кааперацыі—каля 1 млрд. рублёў. Вось суадносіны паміж двума формамі соцыялістычнай уласнасці ў галіне прамысловасці — 48 млрд. рублёў і 1 млрд. рублёў. Інакш кажучы, удзельная вага саматужна-кааператыўнай уласнасці ў прамысловасці складае ўсяго каля 2 проц.

Іншыя суадносіны, відома, у сельскай гаспадарцы. Усе фонды соцыялістычнага сектара ў сельскай гаспадарцы на 1 студзеня 1936 г. складалі 18,5 млрд. рублёў, у тым ліку: саўгасы мелі 5,8 млрд. рублёў, МТС — 2,3 млрд. рублёў, калгасы—8,0 млрд. рублёў. Калі скласці гэтыя лічбы, то выніка ў 18,5 млрд. мы не атрымаем, бо ёсць яшчэ орсы і іншыя арганізацыі, даныя па якіх, з-за іх дробнасці, намі тут не прыводзяцца.

У 1930 годзе ўсе фонды соцыялістычнага сектара ў сельскай гаспадарцы складалі толькі 2,5 млрд. рублёў. За шэсць год мы маем велізарны рост гэтых фондаў. Калгасам у 1936 г. належала каля 40 проц. усіх фондаў соцыялістычнага сектара сельскай гаспадаркі. Але калі мы паглядзім на тэмпы росту асноўных фондаў МТС, то ўбачым у соцыялістычнай сельскай гаспадарцы **больш інтэнсіўны рост дзяржаўнай, усенароднай уласнасці.** У 1930 годзе фонды МТС складалі 3 проц. фондаў калгасаў, а ў 1936 г. іх удзельная вага ўзнялася ўжо да 29 проц. **Гэта значыць, што асноўныя фонды МТС (дзяржаўныя) растуць многа быстрэй, чым асноўныя фонды калгасаў,** хаця і апошнія растуць быстра.

У нашай Канстытуцыі фіксіруюцца прысядзібная зямля і пасевы калгаснікаў на ёй. У адносінах да ўсёй пасеўнай плошчы ў краіне прысядзібная зямля складала ў 1936 г. 3 проц. Калгаснікі маюць на сваіх прысядзібных землях 4 млн. га пасеваў. Нямнога больш 4,5 млн. га, або 3,3 проц. пасеўных плошчаў падае на ўсіх аднаасобнікаў. Супастаўленне гэтых лічбаў вельмі характэрна. Дробная прыватная гаспадарка аднаасобных сялян, якая дапускаецца нашай Канстытуцыяй, мае за сабой столькі-ж пасеўнай плошчы, колькі ёсць у прысядзібных землях калгаснікаў, складаючы ў агульнай плошчы пасеваў невялікі процант. Дапускаючы існаванне прысядзібнай зямлі для гаспадарчых патрэб кожнага калгаснага двара, Сталінская Канстытуцыя гэтым спалучае асабістыя інтарэсы калгаснікаў з грамадскімі, што з'яўляецца дадатковым стымулюючым фактарам вядзення арцельнай гаспадаркі.

Значная ўдзельная вага кааператыўнай уласнасці ў гандлі. Суадносіны дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю тут складаюцца наступным чынам. На працягу апошніх год мы маем каласальны рост дзяржаўнага сектара. У 1932 годзе прыватнік у гандлі быў ужо поўнасцю выцэснен, і дзяржаўны сектар меў 36,6 проц., а кааператыўны — 63,4 проц. У 1936 годзе, пасля таго, як у гарадах спаўвецкая кааперацыя была ліквідавана, тавараабарот дзяржгандлю складаў ужо 76 проц., а кааперацыя — 24 проц. (не лічачы базарнага гандлю). З 1928 года дзяржаўны сектар павысіў свой абарот з 2,5 млрд. да 70 млрд. рублёў, а ўдзельная вага яго ўзнялася з 16 да 76 проц. Абарот кааперацыі павысіўся з 9,3 млрд. рублёў да 21 млрд. рублёў, а ўдзельная вага яе панізілася да 24 проц. (у **звязку з яшчэ большым развіццём дзяржаўнага гандлю).**

Для поўнага аналіза нашага тавараабароту трэба ўлічыць яшчэ калгасны гандаль, у якім у якасці прадаўцоў выступаюць калгасы, калгаснікі і аднаасобнікі. Абарот калгаснага гандлю падлічыць даволі цяжка, але па арыентыровачных даных ён складаў у 1936 г. каля 15 млрд. рублёў, г. зн. каля 15 проц. дзяржаўнага і кааператыўнага абароту. Гэта значыць, што ў галіне гандлю на долю кааператыўнай уласнасці, а таксама на долю калгаснікаў і аднаасобнікаў выпадае значная частка, што, аднак, не падрывае дзяржаўнага гандлю, а салейнічае яму.

Мы бачылі, як расце ў сельскай гаспадарцы ўдзельная вага асноўных фондаў МТС. Уплыў МТС на работу і ўмацаванне калгасаў будзе няўхільна расці. Адрозненне, якое існуе паміж уласнасцю дзяржаўнай, усенароднай і ўласнасцю калгасна-кааператыўнай, у далейшым паступова будзе змяншацца. Ступень гэтага руху наперад будзе залежаць ад узроўню развіцця вытворчасці і пойдзе па меры нашага прасоўвання да вышэйшай фазы комунізма. Перабудова гэта будзе суправаджацца адпаведнай пераробкай не толькі эканомікі, але і псіхалогіі работнікаў соцыялістычнай гаспадаркі, паказальнікам чаго ўжо зараз з'яўляецца магутны стаханаўскі рух. «...Ён падрыхтоўвае ўмовы для пераходу ад соцыялізма да комунізма» (І. Сталін. Прамова на першай нарадзе стаханаўцаў). Адрозненні паміж рабочымі і сялянамі, якія зараз спіраюцца, але яшчэ існуюць, будуць усё больш знішчацца, як спіраюцца і грані паміж працай разумовай і працай фізічнай.

Шлях да комунізма адкрыт. На гэтым шляху мы прайшлі ўжо нямала найпяжэйшых этапаў, хаця нямала цяжкасцей яшчэ і наперадзе. Комунізм не зваліцца да нас з неба. Мы павінны стварыць яго ва **ўпартай барацьбе.** Пад сцягам ленінска-сталінскай партыі, пад кіраўніцтвам вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна мы ўпэўнена ідзем па гэтаму шляху.

ПІСЬМЫ АБ БІРАБІДЖАНЕ

Біраб**і**джан. Яўрэйская аўтаномная вобласць на Далёкім Усходзе. Хто не ведае імя гэтага адроджанага края. Сотні тысяч абязэ**л**оленых працоўных яўрэяў капіталістычных краін марань**л**а**л**а**л**а**л**а ў гэты расквітаючы куток краіны сацыялізма. Сотні і тысячы працоўных нашай краіны перасяляюцца ў Біраб**і**джан, каб будаваць шчаслівае жыццё, умацоўваць магутнасць фарпоста СССР на далёкаўсходніх граніцах. Пісьмы працоўных аб Біраб**і**джане дышаць гарачым совецкім патрыятызмам, любоўю да сваёй соцыялістычнай радзімы.

Дзяўчына Гольфарб Соня з Лагойскага раёна ў адказ на заклік Хетагуравай рашыла паехаць на Далёкі Ўсход і ў прыватнасці хоча астацца жыць у Біраб**і**джане. У сваім пісьме ў Белазет яна піша, што з ёю разам паедзе яе прыяцелька, беларуска. Гэта не першае пісьмо. У Біраб**і**джан перасяляюцца не толькі яўрэі. Белазет атрымлівае пісьмы і ад працоўных іншых нацыянальнасцей. Усіх іх цягне туды будоўля новага края, жаданне ўмацоўваць абароназдольнасць краіны.

Пісьмы, ідучыя з Біраб**і**джана, поўны гордасці і радасці за росквіт, за шчаслівае і радаснае жыццё адзінай у свеце і гісторыі яўрэйскай аўтаномнай вобласці. Простымі словамі расказваецца і аб пераможаных цяжкасцях.

«Вось ужо звыш года, як мы жывем у Біраб**і**джане, — пішуць у Менавет брат і сястра Аллівэнкіны. — У пачатку мы перанеслі некаторыя цяжкасці, цяпер мы добра ўстроены. Вучымся на другім курсе медтэхнікума, для якога будуецца новы будынак. Біраб**і**джан — не пазнаць. Там, дзе была калісьці тайга, вырас горад, дзе ёсць школы-дзесяцігодкі, тэхнікумы, тэатры і т. д. Хутка тут адкрыецца інстытут».

І далей маладыя патрыёты проста і недвухсэнсоўна пішуць: «Добра жыць у нашу эпоху. Добра жыць там, дзе разам з намі расце і будуецца новая вобласць».

У канцы свайго пісьма Адліванкіны просяць Менавет дапамагчы ім перасяліць у Біраб**і**джан сваіх бацькоў з Менска. Яны нават абяцаюць выплаціць ўсе выдаткі па перасяленню пасля сканчэння тэхнікума.

А вось і пісьмо ў рэдакцыю «Окцябр» ад старога рабочага-швейніка Гінзбурга Б. Толькі ў сакавіку ён, яго жонка, дачка і сын паехалі з Старых Дарог у Біраб**і**джан.

«На другі дзень пасля нашага прыезда, — піша Гінзбург,—нас прынялі працаваць на новую швейную фабрыку, на якой будуць працаваць 3 тыс. чалавек. Фабрыка абсталявана па апошняму слову тэхнікі. Рабочыя прыбываюць у Біраб**і**джан з усіх канцоў СССР. Тут таксама працуюць прыехаўшыя з Амерыкі, Кубы, Аргенціны, Польшчы. Многа перасяленцаў з «святой краіны» Палестыны. Відавочна, што сапраўдная радзіма працоўных гэта ў нас у СССР.

Як выглядае горад? Увесь горад я яшчэ не аглядзеў, бо горад вялікі. Шмат каменных дамоў трох-чатырохпавярховых. Пачалося будаўніцтва будынка адзінага ў свеце яўрэйскага горнаметалургічнага тэхнікума (макет гэтага будынка паслан на сусветную Парыжскую выстаўку). У нас ёсць сталы тэатр з добрымі артыстамі, у якім цяпер выступае вядомы артыст Эпельбаум.

Калгаснікі жывуць добра, маюць па дзве-тры каровы, свіней і розную птушку».

Гэтыя простыя пісьмы — дасканалы расказ аб краі, які расквітае пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, аб любві працоўных да сваёй соцыялістычнай радзімы.

Н. ГАСМАН.

Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета 2 мая паставіў оперу «Флорыя Тоска», музыка Пучыні. Пастаноўшчык оперы рэжысер Маскоўскага тэатра імя Немірові-ча-Данчэнка тав. П. С. Златагораў. НА ЗДЫМКУ: сцэна з першага акта. У ролі Тоскі—арт. Друкер і ў ролі Каварадосі—арт. Бароўскі.

Фото С. Грыка і В. Лейна.

ЗВАРОТ ДА ПРАЦЫ

За апошні час у аддзел Крымінальнага вышука БССР пачалі з'яўляцца злачынцы з павінкай. Грамадзянін М. не спяшаючыся расказвае аб усіх сваіх злачынствах, якія ён утвараў. У дзяцінстве ён быў беспрытульным. Яго імкнуліся накіраваць на шлях чэснага жыцця і паслалі ў калонію для беспрытульных. Але ён не можа прымірыцца з рэжымам калоніі. М. уцякае з калоніі. Зноў сустрэчы з таварышамі - злодзеямі, раз'езды па ўсіх гарадах Совецкага Саюза для ўтварэння крадзяжоў. Яго «працоўны» спіс запаўняецца судзімасцямі і прыводамі.

— Я раз і назаўсёды рашыў пакончыць са злачыннай дзейнасцю і жадаю заняцца чэснай працай, — заявіў у Крымінальным вышуку М.

Сваіх бацькоў О. не памятае. Калі яму пайшоў другі год, яны памерлі. Гады ішлі, Хлапчук падрастаў. Беспрытульніцтва, знаёмства са злачынцамі і О. становіцца злодзеям. Пасля — прывод за прыводам, судзімасць, і ён уваходзіць у брудное, нічэснае жыццё. Зараз ён гаворыць, як гаворыць, «выйсці ў людзі». Жаданне ў яго толькі адно — стаць лётчыкам, горным сокалам нашай шчаслівай радзімы. Яго таварышы па былой «работе» І. і П. пасля многіх галоў злачынстваў таксама прышлі з заявамі, што парываюць сувязь з мінулым. Жадаюць вучыцца і працаваць, каб зняць з сябе брудную пляму і набыць гаварове званне грамадзяніна Совецкага Саюза.

Усе яны накіраваны па іх жаданню на работу і вучобу.

С. працаваў старшым касірам Белкомунбанка. Падрабляючы дакументы, ён прысвойваў дзяржаўныя грошы. 8 красавіка 1933 г. быў асуджан на 10 год пазбаўлення волі. Будучы накіроўн для адбыцця пакарання на Асінторф, ён праз месяц збег. Увесь час хаваўся па розных гарадах. Зараз ён з'явіўся з павінкай.

— Абрылася так жыць і хавацца ад пролетарскай грамадскасці, — гаворыць ён, — хачу чэсна адбываць сваё пакаранне.

С. накіроўн для адбыцця свайго пакарання.

І. МІН.

КАЛГАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА

Бібліятэка калгаса «Шлях да соцыялізма», Баратынскага сельсавета, Бабруйскага раёна, налічвае больш 3.000 кніг. Пры бібліятэцы працуе літаратурны гурток, якім кіруе загадчык бібліятэкі т. Шмат. На занятках гурткА ўжо абмеркаваны творы Якуба Коласа, Янкі Купалы, Н. Остроўскага, Новікава-Прыбоя. Часта пасля работы калгаснікі збіраюцца ў сваёй бібліятэцы, дзе праводзяцца чытэлі навінак мастацкай літаратуры. Нядаўна ў калгасе быў праведзен вечар, прысвечаны творчасці народнага паета Янкі Купалы.

Шмат калгаснікаў маюць і свае ўласныя бібліятэчкі. Калгаснік Казлоўскі Т. мае сваю бібліятэку з 75 кніг. У бібліятэцы калгасніка Янкі Картузава ёсць больш 80 кніг класікаў і совецкіх пісьменнікаў.

М. КАЗЛОЎСКІ.

У КАЛГАСНЫХ САДАХ БССР

Калгасы БССР штогодна выручаюць сотні тысяч рублёў ад продажу пладавіны са сваіх садоў. Калгас «Уперад» Мозырскага раёна ў мінулым годзе атрымаў прыбытак ад сваёй садаводнай гаспадаркі 266 тысяч рублёў.

Калгаснае садоўніцтва в кожным годам усё больш развіваецца. За 30 год да Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі на тэрыторыі БССР было пасаджана 8.510 гектараў садоў, а за апошнія гады 32.000 гектараў. У гэтым годзе плошча калгасных садоў пашыраецца на 3.000 гектараў, а па сядзібах калгаснікаў на 500 гектараў. Закладваецца 20 новых калгасных пладовых пітомнікаў.

Асабліва багаты пладовымі садамі Магілёўскі, Віцебскі, Полацкі, Аршанскі і іншыя раёны. У калгасах і соўгасах рэспублікі ёсць 11 пладовых пітомнікаў, якія штогодна даюць 600 тысяч сажанцаў.

Побач з агульным ростам плошчы садоў змяняецца склад насаджэнняў. Усё больш укараняюцца мічурынскія гатункі. У пітомніках вырошчваюцца для масавага продажу калгасам і калгаснікам 11 лепшых гатункаў яблык і ігруш.

Калгасныя сады перазімавалі добра і па стану пладовых почак абяцаюць даць высокі ўраджай яблык.

М. КІН.

НА АДПАЧЫНАК

ВІЦЕБСК. 13 чэрвеня рабочыя швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» ўходзяць у водпуск. Добры адпачынак чакае ў гэтым годзе стаханаўцаў фабрыкі. 500 стаханаўцаў і ўдарнікаў паедуць у дамы адпачынку, 75 чалавек — у санаторыі і на курорты. У фабрычным прафілакторыі адпачыне 60 чалавек. 10 лепшых стаханаўцаў едуць на экскурсію ў Крым і Каўказ, звыш 500 рабочых — у спецыяльныя асаавіяхімаўскія лагеры. Пры садзе швейнікаў арганізоўваецца дзіцячая пляцоўка.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

НА АСУШАНЫХ ЗЕМЛЯХ КАЛГАСАЎ

У гэтым годзе на асушаных землях 50 калгасаў БССР Усесаюзны навукова-даследчы інстытут балотнай гаспадаркі праводзіць вялікую даследчую работу. Доследы вядуцца, галоўным чынам, па вырошчванню розных відаў культур і ўплыву розных угнаенняў на іх.

Мінулай восенню ў калгасе імя Сталіна, Менскага раёна, на асушаных балотах было пасеяна 6 гатункаў азімага жыта і пшаніцы. Які гатунак даць найлепшы ўраджай, такі і будзе потым сеяцца ў калгасе. Вясной тут-жа будуць праведзены вопыты па барацьбе хімічным спосабам з пустазеллем у яравых збожжавых культурах.

У калгасе імя Сталіна, Рэчыцкага раёна, дзе асушана ўжо каля 700 гектараў балот, праводзіцца гатункавыпрабаванне проса на балоце і ўгнаенне пад яго. Тут-жа будзе зроблен пасеў карэньплодаў і штучнае залужэнне тарфянікаў. Доследы па ўплыву калчаданнага агарка на ўраджай проса і іншых збожжавых культур праводзяцца ў калгасах «Чырвоная горка» і «Пражэктар», Дрыбінскага раёна. У калгасах «Чырвоны мяк» і «Трэці рашаючы». Глускага раёна, ідзе вывучэнне ўздзеяння розных доз угнаення пад каноплі праводзіцца і ў Любаньскім раёне—у калгасах «Ударнік», «Прагрэс», «Комуна БВА» і т. д.

Для аказання пастаяннай кансультацыі і практычнай дапамогі на месцах да ўсіх гэтых 50 калгасаў прымацаваны навуковыя работнікі інстытута.

Н. В.

ПІОНЕРСКІЯ ЛАГЕРЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ РАБОЧЫХ СВІНАСОЎГАСАЎ

З 1 ліпеня для дзяцей рабочых свінасоўгасаў рэспублікі адкрываецца 7 піонерскіх лагераў, у якіх будуць адпачываць каля 500 дзяцей. Лагеры адкрыюцца ў соўгасах «Бабінічы», Аршанскага раёна, імя Свердлова, Дзержынскага раёна, «Культура», Чавускага раёна, імя Гікало, Ветрынскага раёна і т. д. У лагерах будуць праведзены фізкультурныя спартакіяды і алімпіяды мастацкай самадзейнасці. На ўтрыманне лагераў адпускаецца 60.000 рублёў.

ТУРЫСЦКІ АРКТЫЧНЫ МАРШРУТ

Турысцка-экскурсійнае кіраўніцтва ВЦСПС у гэтым годзе адкрыла новы арктычны маршрут. На працягу навігацыі ў Арктыку будзе адпраўлена два параходы з экскурсантамі. Маршрут пачынаецца ў Мурманску і праходзіць: вострАў Калгуеў —Амдэрма—Новая Зямля — палярная станцыя Матачкін Шар—Карскае мора ўздоўж берагоў Новай Зямлі да паўночнай аканечнасці Мыса Жаланія — Руская гавань і заканчваецца ў Архангельску.

ГІНУЦЬ ЗЯЛЁНЫЯ НАСАДЖЭННІ

З-за адсутнасці догляду ў Менску гінуць выдатныя дрэвы: конскі каштан на вуліцы 11 ліпеня і ліпы па вуліцы Карла Маркса. На скверыку па вуліцы Кірава загінула некалькі дзесяткаў дрэў ва ўзросце каля 20 год з-за таго, што іх засыпалі смеццем. Па вуліцы Лекерта за мінулую зіму загінула 12 дрэўцаў. Дрэвы часта гінуць ад таго, што да іх прывязваюць слупы электрасеці (на Свердлоўскай вуліцы ў Менску).

Кожны год трацяцца вялікія сродкі на азеляненне Менска. Між тым зялёныя насаджэнні горада радзеюць. Кіраўнікі комунальнай гаспадаркі і жакты не лічаць сваім абавязкам арганізаваць ахову зялёных насаджэнняў.

Трэба стварыць асобны штат па кантролю за зялёнымі насаджэннямі, у сухое надвор'е паліваць дрэвы. Неабходна забараніць кладку камення ўшчыльную да дрэў, знішчэнне дрэў пры ўпарадкаванні вуліц і пры пабудовах.

Настаўнік Г. РАК.

„ПРЫЗ БССР" ПА ФУТБОЛУ

У адпаведнасці з пастановай усесаюзнага камітэта па справах фізкультуры і спорта, Камітэт па справах фізкультуры і спорта БССР адмяніў розыгрыш па футболу на «кубак БССР», устаноўлены ў 1936 годзе. З гэтага года ўстаноўлен весенні розыгрыш па футболу на пераходзячы «прыз БССР», які будзе на працягу 3-х год уручацца камандзе-пераможцы штогоднага розыгрыша.

ЗДАРЭННІ

* Падпал на глебе раўнасці. На пасёлку Высокае поле, Кармянскага сельсавета (Добрушскі раён) загарэўся хлеў, які належыць гр. Д. Т. Чыркову. У агні загінулі дзве каровы, цёлка і свіння. Таксама згарэлі ад гэтага пажару тры дамы з надворнымі пабудовамі, якія належаць калгаснікам калгаса «Майскі».

Следствам устаноўлена, што падпал хлява ўтварыла грамадзянка вёскі Карма В. Е. Сідаранка на глебе раўнасці да свайго мужа К. І. Сідаранка. Апошні, пакінуўшы часова жонку ў вёсцы Карма з жніўня мінулага года пасяліўся ў доме Чыркова і стаў гуляць з яго дачкой. Даведаўшыся аб гэтым В. Е. Сідаранка, каб адпомсціць Чырковым — падпаліла іх хлеў.

Сідаранка арыштавана і прыцягваецца да судовай адказнасці.

ПАДСТАЎНЫЯ СПАРТСМЕНЫ

У канцы красавіка ў Маскве адбыліся ўсесаюзныя спаборніцтвы па цяжкай атлетыцы добраахвотнага фізкультурнага таварыства «Баец» (Саюз мясахаладзільнай прамысловасці). У іх прымала ўдзел і каманда беларускага таварыства «Баец». Як выявілася, гэта таварыства не мае ў БССР ні аднаго гіравіка і барца. Таварыства рашыла ўсё-ж вызначыцца на гэтых спаборніцтвах і склала каманду з... членаў іншых менскіх спартыўных таварыстваў. Ад «Спартака» былі «пазычаны» барэц Катун і штангіст Зелікаў, ад «Тэмпа» — барцы Вігдорчык і Бабіцкі, штангіст Андрэеў і т. д. За дзень да выезду ў Маскву ўсю гэту кампанію аформілі, як членаў таварыства «Баец», прычым кожнага з асобным фіктыўным стажам.

За «пакупку» і перамаўванне спартсменаў Беларускі камітэт па справах фізкультуры і спорта прапанаваў бюро фізкультуры ЦСПСБ і оргбюро таварыства «Баец» неадкладна зняць з работы адказнага сакратара таварыства Маслана. Справа аб старшыні ЦП саюза мясахаладзільнай прамысловасці БССР тав. Шэўчэнка, які з'яўляецца старшынёй таварыства «Баец», перадаецца ў Камісію Совецкага Кантроля для прыцягнення да адказнасці. Спартсмены Катун, Зелікаў, Андрэеў, Вігдорчык і Бабіцкі дыскваліфікаваны на 1 год. Беларускі камітэт апрача таго забараніў выкарыстоўваць інструктароў фізкультуры Катуна і Зелікава на кіруючай фізкультурнай рабоце на працягу двух год.

І. ЦЫВЕС.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Нізэйшаменаёныя ў спісу таварышы выклікаюцца Партклегіяй пры Ўпаўнаважаным КПК пры ЦК ВКП(б) па БССР (г. Менск, Чырвонаармейская, 16, 3-ці паверх, пакой № 26) на 13 мая 1937 г. к 11 гадзінам дня для разбору іх апеляцыйных спраў:

Селянаў П. С.—Добруш, Фрыдман Г. М.— Асіновічы. Войтка С. С., Подзіло Г. М. — Капаткевічы, Берлін Н. А. — Магілеў, Бабкоў В. Н., Васіленка І. А. — Цераховка, Наўменка А. Л., Шэндераў Н. І. — Мазыр, Гурэвіч М. І.—Рэчыца, Кадацкі С. Пл., Жураўскі Ф. А., Залескі С. М., Молчан Д. І., Лапін В. Ф. — Менск. Горбаў В. П., Нікіцюк Н. Р. — Круглае, Сазонаў М. К. — Гарадок, Стефіч І. Г. — Лёзна. Макуя Ф. К.— Дрыса, Салохін І. В. — Вешанковічы, Похілка Д. Г., Тябачнік І. Я. — Халопенічы, Нікіціна М. Р. — Мехава, Шляга Д. А. — Полацк, Хадыка Г. П. — Смалявічы.

Партклегія пры Уп. КПК па БССР.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ЛЕКТОРЫЙ ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДОМЕ ТЭХНІКІ (Комсамольская, 15)

12 мая для гаспадарнікаў, стаханаўцаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў адбудзецца лекцыя прафесара С. М. ФРЫДА на тэму: «Бактэрыялагічная вайна». Пачатак лекцыі роўна ў 8 гадзін вечара. Білеты ў канцылярыі Дома тэхнікі штодзённа з 2 да 4 гадзін дня (білеты для гаспадарнікаў у наркаматах).

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
12 мая Абан. № 103. АПОШНІЯ. Аноніс «Скупы».

Дзярж. Яўрэйск. тэатра | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
31 мая Абан. № 34. ФЛОРЫЯ ТОСКА

Гукавы кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» УМВАР

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» ГОБСЕК

Дзіцячы гукавы кінатэатр у сувязі з рамонтам закрыт.

Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» НА АДПАЧЫНКУ

Гукавы кінатэатр «СПАРТАК» КНЯЖНА МЭРЫ (намы варыянт)

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 11 МАЯ:
16 — мантаж аперэты. 17 — перадача для дзяцей. 18.30 — завочная партвучоба. 19.30 — канцэрт. 20 — перадача ў дапамогу самаадукацыі. 21 — трансляцыя канцэрта Філармоніі. 23 — «Апошнія паведамленні». 23.15 — «Апошнія паведамленні» на польскай мове.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 12 МАЯ:
10.30 — канцэрт для дзяцей. 16 — канцэрт па заяўках радыёслухачоў. 17.30 — літаратурная перадача на яўрэйскай мове. 18.15 — міжнародны агляд. 18.50 — канцэрт. 21 — трансляцыя канцэрта з Дома Чырвонай Арміі.

Згублена круглая пячатка калгаса імя «2-й Беларускай дывізіі», Папяжынскага сельсавета, Астрашыцка-Гарадзецкага раёна. Лічыць несапраўдкай.

РЭДАКЦЫІ «ЗВЯЗДЫ» патрэбны МАШЫНІСТКІ на дзённую і вячэрнюю работу. Звяртацца па тэл. № 20-830, ці непасрэдна ў сакратарыят (трэці паверх).

ДА ЎВАГІ РК КП(б)Б, РК ЛКСМБ, ПАРТГАБІНЕТАЎ, ФАБЗАЎМЯСЦКОМАЎ, ДАМОЎ СОЦЫКУЛЬТУРЫ І ВАЙСКОВЫХ ЧАСЦЕЙ.

КОГИЗ Беларускае аддзяленне

ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ ПАЛІТГРАМАТЫ НА РУСКАЙ МОВЕ.

ІНГУЛАЎ — ПАЛІТБЯСЕДЫ. 3 пераапрацаванае выданне. Партвыдат. 1937 г., 360 стар. Ц. 3 р. 25 к. (у каленкор. пераплёце).
Кароткая палітграмата для горада.

КАРПІНСКІ — БЯСЕДЫ АБ СОЦЫЯЛІЗМЕ. Выд. 4 пераапрацаванае. Партвыдат. 1937 г., стар. 472. Ц. у пераплёце 2 р. 75 к.
Падручнік палітграматы для вясковых школ.

ВОЛІН І ІНГУЛАЎ—ПАЛІТГРАМАТА. 3 выд. Партвыдат. 1937 г., стар. 284. Ц. 3 р. 75 к. (у каленкор. пераплёце).
Палітграмата для гарадскіх кандыдацкіх школ.

ПАТРАБУЙЦЕ ВА ЎСІХ МАГАЗІНАХ КОГИЗ'а.

ЗАКАЗЫ накіроўвайце ў бліжэйшыя кніжныя магазіны КОГИЗ'а або па адрасу: Менск, Совецкая, 50, Беларускаму аддзяленню КОГИЗ'а.

ЗАКАЗЫ ВЫКОНВАЮЦЦА НАЛОЖАНЫМ ПЛАЦЯЖОМ.

ДЗЯРЖПЛАН БССР
ІНСТЫТУТ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ ІМЯ В. В. КУЙБЫШЭВА
абвяшчае ПРЫЁМ студэнтаў на 1937/38 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Інстытут рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне эканомікі і планавання народнай гаспадаркі.

У склад інстытута ўваходзяць чатыры факультэты:
а) ПЛАНАВЫ факультэт рыхтуе эканамістаў-планавікоў для сістэмы Дзяржплана БССР і іншых наркаматаў;
б) ФІНАНСАВЫ факультэт рыхтуе эканамістаў-фінансістаў для Наркамфіна, сістэмы Дзяржбанка і апчаднас;
в) факультэт СОВЕЦКАГА ГАНДЛЮ рыхтуе эканамістаў таварабароту для Наркомунтаргпрыдзіла, Всекасбанкаюза і абітавых арганізацый;
г) факультэт НАРОДНА-ГАСПАДАРЧАГА ЎЧОТА рыхтуе эканамістаў народнагаспадарчага ўчота вышэйшай кваліфікацыі (эканамістаў, старшых эканамістаў, кансультантаў Цэнтральнага кіраўніцтва Наргаспучота, КНГУ саюзных рэспублік, абласцей, краяў, гарадскіх або раённых інспектар наргаспучота).

Тэрмін навучання — 4 гады. Заняткі дзённыя.

У інстытут прымаюцца ўсе грамадзяне абодвух полаў, ва ўзросце ад 17 да 35 год, якія маюць скончаную сярэднюю адукацыю, або атрымаўшыя атэстат аб сканчэнні сярэдняй школы ў парадку экстэрната.

ЗАЎВАГА: асобы, скончыўшыя да 1935 г. школу II ступені (дзесяцігодку) або скончыўшыя 3-гадовыя на базе сямігодкі прафесіянальныя школы, дапускаюцца да прыёмных іспытаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы нараўне са скончыўшымі сярэднюю школу, рабочыя факультэты і тэхнікумы.

Паступаючыя на 1 курс падвяргаюцца ўступным экзаменам у аб'ёме праграм сярэдняй школы па наступных прадметах: а) руская мова і літаратура, б) беларуская мова і літаратура; в) палітграмата, г) матэматыка, д) фізіка, е) хімія, ж) геаграфія, з) адна з замежных моў (англійская, нямецкая, французская).

Скончыўшыя сярэднюю школу і маючыя на ўскоўных прадметах адзнакі «выдатна», а па астатніх прадметах (маляванне, чарчэнне, музыка, фізкультура) — адзнаку не ніжэй «добра», прымаюцца ў інстытут без уступных экзаменаў.

Для асоб, якія здаюць уступныя экзамены, арганізавана кансультацыя.

Заявы аб прыёме падаюцца на імя дырэктара інстытута, прыкладваць пры гэтым аўтабіяграфію і наступныя дакументы: а) атэстат (у арыгінале) аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы — дзесяцігодкі, рабфака, тэхнікума, б) пашпарт (прад'яўляецца асабіста), в) тры фотакарткі з улікавым подпісам паступаючага на кожнай з іх, засведчаныя дзяржустановай, д) ваенна-абавязаныя прадстаўляюць апрача вышэйпамянёных дакументаў, даведку аб адносінах да воінскай павінкасці.

Прыём заяў праводзіцца да 1 жніўня 1937 г. Прыёмныя іспыты — з 1 па 20 жніўня 1937 г. Залічэнне ў лік студэнтаў з 21 па 25 жніўня 1937 г.

Прыняты ў інстытут забяспечваюцца: а) стыпендыяй на агульных падставах, б) упарадкаваным інтэрнатам (толькі іншагародніх).

ЗАЎВАГА: сем'і прынятых у інстытут інтэрнатам не забяспечваюцца.

Асобы, дапушчаныя да прыёмных іспытаў, з'яўляюцца ў інстытут толькі да выклікі, маючы пры сабе пашпарт.

Пачатак заняткаў — 1 верасня 1937 г.

Заявы накіроўваюцца па адрасу: г. Менск, Універсітэцкі гарадок, Землеробскі завулак, 5, тэл. 23-206.

ДЫРЭКЦЫЯ.

АДДЗЕЛ ПАДПІСКІ БЕЛАРУСКАГА АДДЗЯЛЕННЯ КОГИЗ'а

Працягваецца прыём ПАДПІСКІ на АЛЬБОМЫ ГРАМАФОННЫХ ПЛАСЦІНАК:

Даклад тав. СТАЛІНА (21 пласцінка)

і ПРАМОВА тав. МОЛАТАВА (19 пласцінак)

НА НАДЗВЫЧАЙНЫМ VIII УСЕСАЮЗНЫМ З'ЕЗДЗЕ СОВЕТАЎ. АЛЬБОМЫ ГРАМАФОННЫХ ПЛАСЦІНАК ПРЫГОЖА АФОРМЛЕНЫ.

ЦАНА КОЖНАГА АЛЬБОМА 77 руб. 40 кап.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ўсімі райаддзяленнямі, магазінамі і ўпаўнаважанымі КОГИЗ'а, а таксама аддзелам падпіскі КОГИЗ'а—Менск, Совецкая, 73.

Пры падпісцы ўносіцца задатчная сума 50 рублёў.

У гарадах і сёлах, дзе няма магазіна КОГИЗ'а, заяўку з задаткам 50 р. за кожны альбом накіроўвайце па адрасу: г. Менск, Совецкая, 73, аддзел падпіскі КОГИЗ'а.

АЛЬБОМЫ з грампласцінкамі пачалі паступаць у аддзел падпіскі для рассылкі падпісчыкам.

БЕЛДЗЯРЖКІНО
праводзіць дадатковы НАБОР НА АЦЕРСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ВХУ.

Заявы прымаюцца ад асоб абодвух полаў ва ўзросце ад 17 да 18 год з сярэдняй адукацыяй пры наяўнасці сцэнічнага выгляду.

ІСПЫТЫ праводзяцца ў аб'ёме сярэдняй школы па рускай і беларускай мовах і літаратуры, геаграфіі і агульнапалітычнаму развіццю і апрача таго спецыяльны для выяўлення прафесіянальнай прыгоднасці.

Асобы, якія скончылі ў 1936-37 г. дзесяцігодку на выдатна і добра ад іспытаў па агульнаадукацыйных дысцыплінах вызваляюцца.

Прыём заяў з фотакарткай праводзіцца да 15 мая ўключна па адрасу: г. Менск, Совецкая, 90, Белдзяржкіно (2-гі паверх, пакой 19).

Прынятыя забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам не забяспечваюцца. Тэрмін навучання 4 гады. Пачатак заняткаў 1 чэрвеня 1937 г.

БЕЛДЗЯРЖКІНО.

ШКОЛА ФЗВ «БУДЎЧ» БЕЛПРАМБУДТРЭСТА
абвяшчае НАБОР вучняў У КАМЕННА-ТЫНКАВАЛЬНЫ ЦЭХ

Тэрмін навучання — 1 год.

Школа забяспечвае вучняў стыпендыяй ад 45 да 75 р. у месяц па паспяховасці, і іншагародніх — інтэрнатам.

Прымаюцца асобы ва ўзросце ад 15 да 19 год з адукацыяй 6—7 класаў.

Дакументы трэба прадставіць наступныя: заяву, даведку аб адукацыі, аб сяброўстве, аб сацыяльнасці, метрыку, дзве фотакарткі і на 40 кап. паштовых марак, па наступнаму адрасу: г. Менск, Рыжская, 22.

Тэрмін падачы дакументаў да 15 мая.

У аддзел аб'яў званіце па тэл. 21-845

11 і 13 мая, а 5 гадзін вечара, у Беларускім дзяржаўным універсітэце (хімічны корпус, аўдыторыя 36) будзе прачытана ЛЕКЦЫЯ праф. Маскоўскага універсітэта СЫРКІНА Я. К. на тэмы:
1. Прырода хімічных сіл.
2. Будова малекул у свеце сучасных фізічных метадаў.
Уваход вольны.

РЭКТАРЫЯТ.

ДА ВЕДАМА НАСТАЎНІКАЎ ШКОЛ г. МЕНСКА І СТУДЭНТАЎ

12 мая, роўна ў 7 гадзін вечара, менскі Педагагічны інстытут арганізуе лекцыю праф. І. С. ЗВАВІЧА (Масква) на тэму: «БЕЛЬГІЯ І ЯЕ «НЕЙТРАЛІТЭТ».

Лекцыя адбудзецца ў галоўным корпусе Універсітэцкага гарадка (аўдыторыя № 302). Уваход вольны.

ДЫРЭКЦЫЯ МПІ.

ПРАВІЛЫ ПРЫЕМУ
ў Беларускі дзяржаўны медыцынскі інстытут НА 1937-38 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

У Беларускі дзяржаўны медыцынскі інстытут прымаюцца грамадзяне Саюза ССР абодвух полаў ва ўзросце ад 17 да 35 год, якія маюць закончаную сярэднюю адукацыю (дзесяцігодка, рабфак, тэхнікум), або атрымаўшыя атэстат аб сканчэнні сярэдняй школы ў парадку экстэрната.

УВАГА: а) асобы, якія скончылі курсы падрыхтоўкі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, дапускаюцца да прыёмных іспытаў толькі пры наяўнасці ў іх атэстата аб сканчэнні сярэдняй школы, рабфака або тэхнікума.

б) Асобы, якія скончылі да 1935 г. школу II ступені (дзесяцігодку) або 3-гадовыя, на базе сямігодкі, прафесіянальныя школы ў ВССР і УССР, дапускаюцца да прыёмных іспытаў нараўне са скончыўшымі дзесяцігодку.

в) Скончыўшыя тэхнікумы да пускаюцца да прыёмных іспытаў пры наяўнасці ў іх устаноўленага законам 3-гадовага вытворчага стажа.

г) Асобы з нясконченай вышэйшай адукацыяй дапускаюцца да прыёмных іспытаў на агульных падставах у адпаведнасці з гэтым артыкулам.

Тыя, што скончылі дзесяцігодку і маюць на аспэктных прадметах адзнакі «выдатна», а па астатніх прадметах (маляванне, чарчэнне, спевы, музыка, фізкультура) адзнакі «добра», прымаюцца на без іспытаў.

Усе астатнія падвяргаюцца іспытам па наступных прадметах: беларускай і рускай мовах (пісьмовы твор, граматыка і літаратура), матэматыцы, фізіцы, хіміі і па адной з замежных моў — англійскай, нямецкай або французскай, на выбару паступаючага.

Іспыты па беларускай і рускай мовах і па матэматыцы — вусныя і пісьмовыя, а па астатніх прадметах —толькі вусныя.

Паўторныя іспыты не дапускаюцца.

Прыём заяў з 20 чэрвеня па 1 жніўня. Заявы падаюцца на імя дырэктара медыцынскага інстытута з прыкладваннем наступных дакументаў: а) аўтабіяграфіі, б) атэстата аб сканчэнні сярэдняй навучальнай арыгінале), в) пашпарт (прад'яўляецца асабіста), г) трох фотакартак (адзінкі без галаўнога ўбору, пажадана размерам 3х4 см.) з улікавымі подпісамі паступаючага на кожнай з іх, заверанымі дзяржустановай, д) даведкі аб адносінах да ваенскай службы (для ваеннаабавязаных).

Скаргі на недапушчэнне да прыёмных іспытаў могуць падаваць у Наркамат аховы здароўя праз дырэктара медыцынскага інстытута.

Прыёмныя іспыты з 1 па 20 жніўня, залічэнне ў лік студэнтаў — з 21 па 25 жніўня.

Да залічэння ў медінстытут дырэктар арганізуе медыцынскі агляд усіх паступаючых.

Асобы, залічаныя ў медінстытут, але без уважлівых прычын не прыступіўшыя да заняткаў з пачатку навучальнага года, а ліку студэнтаў выключаюцца. Скаргі на адмаўленне на залічэнне ў лік студэнтаў могуць падаваць да пачатку навучальнага года ў Наркамат аховы здароўя праз дырэктара інстытута.

Інстытут прымае 400 чалавек на першы курс.

Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй і інтэрнатам ва ўстаноўленым парадку.

Інстытут не прымае на свой кошт нікіх выдатка ў па праезду на іспыты.

Дакументы накіроўваць па адрасу: г. Менск. Універсітэцкі гарадок, анатамічны корпус, медінстытут, прыёмовай камісіі. Прыём там-жа з 15 да 6 гада.

Дырэктар інстытута праф. МАНАХАЎ.

Уп. Галоўлітбела № К—2086. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63.

Б. К. С.